

ЗАГАДКАВЫ ЛІСТ У МІРСКІМ ЗАМКУ **8**

НОВЫЯ КУЛЬТУРЫ ДЛЯ ВАШАГА САДУ **13**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 КАСТРЫЧНІКА 2018 г. АЎТОРАК № 199 (28815)

**ЛІЧБА ДНЯ**

**77 краін**

*свету налічвае сёння геаграфія паставак беларускіх прадуктаў харчавання, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт. І яна ўвесь час пашыраецца. Беларусь адносіцца да краін з самадастатковай вытворчасцю сельскагаспадарчай прадукцыі. Харчовая бяспека беларусаў знаходзіцца на высокім узроўні і мае станоўчую дынаміку. Краіна лідзіруе ў СНД па вытворчасці на душу насельніцтва бульбы (у 2017 годзе — 675 кг), мяса (127 кг), малака (771 кг), яек (375 штук). Па сярэднедушавой вытворчасці збожжа (842 кг) і агародніны (206 кг) Беларусь займае пятае месца. На аднаго жыхара краіны ў 2017 годзе выраблялася мяса ўдвая больш, чым у Расіі і Казахстане. Па вытворчасці малака на душу насельніцтва Беларусь апярэджвае Казахстан у 2,5 раза, Арменію, Украіну і Расію — у 3-3,6 раза.*

# ЗБЕРАГЧЫ КАШТОЎНАСЦІ



Фота БелТА.

## Адзінства дзяржавы і канфесій — найлепшая абарона ад пагроз

**Такое меркаванне выказаў кіраўнік дзяржавы на сустрэчы з членамі Свяшчэннага Сінода Рускай праваслаўнай царквы і Сінода Беларускай праваслаўнай царквы.**

### Свет імкліва змяняецца

У пачатку мерапрыемства беларускі лідар выказаў падзяку за тое, што месцам чарговага пасяджэння Свяшчэннага Сінода Рускай праваслаўнай царквы стала беларуская сталіца. На думку Прэзідэнта, гэта з'яўляецца сведчаннем высокай ацэнкі намаганняў нашай дзяржавы па захаванні міру і згоды, развіцці міжканфесійнага дыялогу і падтрымцы канструктыўных ініцыятыў рэлігійных арганізацый.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка адзначыў неацэнны ўклад Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла ва ўмацаванне ўзаемадзеяння царквы і беларускіх улад, падтрыманне і развіццё духоўных сувязяў брацкіх народаў Беларусі і Расіі. «Мы высока цэнім вашу пастырскую апеку і ўвагу да нашай краіны», — дадаў ён.

**СТАР. 2**

# КАСТРЫЧНІК У МАІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхары Мая Аляксандр і Галіна ГАРМАНЕНКІ разам ужо 39 гадоў.**

**Адзіная ў Беларусі вёска — цёзка пятага месяца года — Май знаходзіцца за дзесяць кіламетраў ад партовага горада Рэчыца ў паўднёвым напрамку.**

**СТАР. 4**

**КОРАТКА**

- Беларускі медыцынскі IT-стартап увайшоў у шорт-ліст прэстыжнай міжнароднай прэміі Aspirin: Social Innovation Award 2018.
- **Сетка 4G стала даступная жыхарам усіх раённых цэнтраў Магілёўскай вобласці.**
- Канцэрт XIII Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета прайшоў у ноч на 14 кастрычніка на платформе мінскага метро.



- **У Брэсце да тысячагоддзя горада ўкарэняць сістэму сумеснага выкарыстання веласіпедаў (веласhэрынг).**
- У Ляхавіцкім раёне Брэсцкай вобласці пры пажары на ферме выратавалі 167 цялят.

ISSN 1990 - 763X

Падпіска-2018

# «Ты адно запомні, браце, са «Звяздой» — цяплей у хаце!»

**І вядома ж, не толькі з-за светлай назвы, роднай мовы ды свайго шаноўнага ўзросту. Газета сто другі гадок жыве жыццём краіны, паважае сваіх чытачоў і нават клапоцціца пра іх, што праяўляецца яшчэ і ў выбары прызоў: яны, звяздоўскія, здаецца, заўсёды маглі не проста парадаваць адданых падпісчыкаў, але і спатрэбіцца ў гаспадарцы, верна паслужыць — прычым усёй сям'і.**

**СТАР. 13**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# ЗБЕРАГЧЫ КАШТОЎНАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Беларускі лідар звярнуў увагу, што Беларусь за гады сваёй незалежнасці разам з праваслаўнай царквой прайшла доўгі і цярністы шлях умацавання духоўных асноў, здабыцця грамадствам маральных, жыццёвых арыенціраў.

«Цяперашні напружаны, насычаны імклівымі зменамі час ставіць новыя задачы і ўвесь час выпрабоўвае нас на трываласць. XXI стагоддзе — эпоха глабальных трансфармацый. Гэты час прагрэсіўных тэхналогій з іх бязмежнымі магчымасцямі, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Але гэтая бязмежнасць, на жаль, становіцца крыніцай шматлікіх пагроз і ў палітычнай, і ў духоўнай сферах».

На яго думку, сёння ў імя ўяўнай дэмакратыі вольна ці мімаволі такія дзяржаўныя каштоўнасці як абарона правоў і свабод грамадзян падмяняюцца ўсёдазволенасцю і адмаўленнем нашых маральных асноў. Як вынік — адчужэнне, абыякавасць і нецярпімасць, якія спараджаюць непрыманне людзей іншых нацыянальнасцяў і веравызнанняў.

«Спрэчкі і рознагалоссі выліваюцца ва ўзаемны недавер, інфармацыйнае супрацьстаянне, гандлёвыя войны, ды і ўзброеныя сутыкненні, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мноства канфліктаў — гарачых, тых, якія тлеюць, замарожаных — бесперапынна адбіраюць чалавечыя жыцці, сеюць боль і пакуты, спараджаюць агрэсію ў розных рэгіёнах, у тым ліку ў непасрэднай блізкасці ад Беларусі».

Прэзідэнт дадаў, што на пытанне, як вярнуць мір людзям, якія не па сваёй волі апынуліся ў эпіцэнтры гэтых падзей, адказу нярэдка не бывае. Пры гэтым пытанне актуальнае для ўсіх і не раз станавілася прадметам дыскусій на розных, у тым ліку самых аўтарытэтных, міжнародных пляцоўках і форумах.

### Памятаем пра мінулае

Таксама беларускі лідар падкрэсліў: Беларусь яшчэ памятае трагічныя ўрокі сваёй гісторыі. «Таму мы цэнім мір, бяспеку, дружбу і паразуменне. Выступаем за адкрыты дыялог, супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне дзяржаў і народаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах кіраўніка дзяржавы, беларускія ініцыятывы, накіраваныя на абарону і захаванне традыцыйных каштоўнасцяў, вядомыя. Частка з іх легла ў аснову рашэнняў ААН, міжнародных і рэгіянальных арганізацый.

Ён канстатаваў, што Мінскі працэс і Мінскія дамоўленасці сталі візітнай карткай Беларусі як пляцоўкі для перагавораў па сітуацыі ва Украіне. «Мы найбліжэйшыя суседзі, брацкія, славянскія народы. І далей будзем рабіць усё магчымае для таго, каб на ўкраінскую зямлю хутчэй вярнуліся мір і згода. Раскол — гэта не пра нас, гэта не для нас. І мы зробім усё, я ўпэўнены ў гэтым. Час — самы лепшы лекар і суддзя, мы абавязкова будзем разам, таму што расколаць нас немагчыма», — падкрэсліў Прэзідэнт.

На думку беларускага лідара, попыт на абнаўленне сістэмы мер па ўмацаванні даверу, бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўропе з кожным днём толькі расце. І цяпер прыйшоў час звярнуцца да найлепшага вопыту сусветнай гісторыі — Хельсінкскага працэсу мінулага стагоддзя, які быў агучаны на мінскай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ.

«Пазіцыя Беларусі ў пытаннях пераадолення рознагалоссяў у еўрапейскай і еўразійскай прасторах застанецца нязменнай. І тут, па маім глыбокім перакананні, голас царквы — адзін з найбольш магутных і ўплывовых — павінен гучаць ва ўнісон з дзяржавай», — падкрэсліў Прэзідэнт.

### Аснова — гэта згода

Прэзідэнт адзначыў, што на шляху супрацьку разбуральным тэндэнцыям сучаснасці ў дзяржавы і праваслаўнай царквы шмат агульных пагляддаў, найважнейшыя з іх — умацаванне хрысціянскіх жыццёвых арыенціраў, міжнацыянальнага міру, міжканфесійнага дыялогу і добрасуседства ўсіх рэлігій.

«Абарона інстытута сям'і, шанаванне бацькоў, любоў да людзей, выхаванне патрыятызму, павага да гісторыі, мовы і культуры, сумленная праца — гэта базавыя каштоўнасці, уласцівыя праваслаўю, каталіцтву, іўдаізму, ісламу. Таму згода паміж прадстаўнікамі традыцыйных рэлігій з'яўляецца непарушнай асновай жыцця ў нашай краіне», — заявіў ён.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: аб'ядноўваючыся ў духоўных і маральных арыенцірах, дзяржава і канфесіі паказваюць узор высокаарганізаванага грамадства. «Наша адзінства — найлепшая абарона ад знешніх і ўнутраных пагроз», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама Прэзідэнт заявіў, што ад Украіны ідуць кругі ў розныя бакі, гэта немагчыма не ўбачыць, тым больш тут, у Беларусі. Ён адзначыў, што ведае, як служыцелям царквы няпроста, паколькі яны — уладары сэрцаў людзей. Кіраўнік дзяржавы дадаў, што прычыны, з якімі ім пазней даводзіцца разбірацца, ляжаць у саміх людзях.

«Як бы ні складвалася сітуацыя, мы будзем рабіць усё, каб у мірнай Беларусі ніколі не было антаганістычных сутыкненняў не толькі рэлігій, але, барані Божа, паміж намі, праваслаўнымі. Будзем рабіць усё для таго, каб дзяржава і народ умацоўваліся ў праваслаўнай веры. Мы зробім усё, каб захаваць наша адзінства», — запэўніў прысутных кіраўнік дзяржавы.

### З найлепшымі пажаданнямі

У падарунак ад членаў Свяшчэннага Сінода Рускай праваслаўнай царквы і Сінода Беларускай праваслаўнай царквы Аляксандр Лукашэнка атрымаў унікальны асобнік перакладзенага са старажытнагрэчаскай на сучасную беларускую мову Святога Пісання Новага Запавету.

Беларускія навукоўцы працавалі над перакладам пісання 25 гадоў — гэты факт на сустрэчы агучыў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

Дарчы, на асабістай сустрэчы кіраўніка дзяржавы з Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Кірылам таксама не абышлося без падарункаў: беларускі лідар атрымаў вобраз Уладзімірскай іконы Божай Маці і памятны медаль у гонар 100-годдзя аднаўлення патрыяршаства, а патрыярх — ікону з выявай беларускіх святых — Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага і Валянціны Мінскай — на фоне Свята-Духава кафедральнага сабора.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# З ДУМКАЙ ПРА ВЕРУ

## У Беларусі будуць падтрымліваць адзінства, каб захаваць мір на зямлі

**Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка за сустрэчы з Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Кірылам.**

Прэзідэнт цёпла прывітаў патрыярха і ўспомніў яго перыяд служэння царкве, які папярэднічаў патрыяршаму сану. «У мяне ў памяці засталося ваша перамяшчэнне са Смаленска ў Калінінград і абавязкова праз нашу Беларусь. І напэўна, з тых часоў вы ўлюбіліся ў гэтую зямлю, не чужую для вас зямлю», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што хоча, каб патрыярх Кірыл разумеў яго пазіцыю, хоць беларускі лідар імкнецца не рабіць ніякіх заяў у гэтай сувязі.

«На жаль, наша царква вельмі часта ў гісторыі станавілася заложніцай міждзяржаўных адносін. Часам нашых няправільных учынкаў, — канстатаваў Прэзідэнт. — Вы павінны ведаць нашу непахісную дзяржаўную пазіцыю: раскол — гэта заўсёды дрэнна. І гэта дрэнныя наступствы, гэта небяспечней за ўсё. Мы вельмі балюча ставімся да таго, што адбываецца сёння ў праваслаўі. Вы гэта адчуваеце не менш за мяне, а можа быць нават больш, сэрцам сваім, успрымаеце душэўна — свет змяніўся. Мала таго, што ён паскорыўся, ён змяніўся не да лепшага».

Паводле яго слоў, заложнікамі бягучага становішча стала ўсё насельніцтва планеты. Перш за ўсё, прыйшоў дрэнны настрой, а настрой, звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, заўсёды быў адказнасцю царквы. «Таму гэта б'е перш за ўсё па царкве, па служыцелях», — дадаў Прэзідэнт.

Беларускі лідар пажадаў Патрыярху мудрасці і цярпення, а таксама запэўніў у тым, што прыхаджане будуць старацца падтрымліваць яднанне ўсіх працэсаў, каб захаваць мір на зямлі. «Ужо занадта блізка мы падышлі да гэтай небяспечнай рысы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што прыезд патрыярха Кірыла ў Беларусь вельмі актуальны. «Ну, напэўна, так Госпадам прадвызначана, у нейкія моманты — ну не тое, што небяспечныя, — сур'ёзныя, моманты — мы апынаемся ў Мінску — і палітыкі, і духавенства. Я гэта вельмі цаню, і гэта нас да многага абавязвае. І, Уладыка, мы справімся з гэтым», — запэўніў Прэзідэнт.

У сваю чаргу Патрыярх Кірыл адзначыў, што кожны раз, калі ён наведвае Беларусь, у яго добры настрой. Ён таксама пацвердзіў, што з Беларуссю ў яго звязана вялікая частка жыцця, нягледзячы на тое, што тут не жыў, а толькі перамяшчаўся транзітам. Патрыярх расказаў Прэзідэнту, што можа параўнаць Беларусь сёння і Беларусь 90-х гадоў мінулага стагоддзя.

Перамены велізарныя — так лаканічна патрыярх Кірыл апісаў тое, што адбываецца ў нашай краіне. На яго думку, гледзячы на чыстыя і прасторныя вуліцы Мінска, разумееш, што Прэзідэнт і ўлада звяртаюць увагу на якасць жыцця людзей.

Ён таксама дадаў, што сёння вельмі шмат праблем, якія выцякаюць з тэхналагічнага развіцця. «Хочам мы ці не хочам, чалавечая цывілізацыя развіваецца так, што з-за грэшнага імкнення павялічваць спажыванне кожным чалавекам — а гэта імкненне грэшнае — вельмі моцна развіваецца прамысловасць, адсюль забруджванне асяроддзя. І многае такое, што наносіць шкоду чалавеку. Вось таму, вядома, клопат улады аб навакольным асяроддзі, культурным асяроддзі, аб духоўным асяроддзі сведчыць аб тым, што самыя галоўныя стратэгічныя мэты і задачы, ад якіх рэальна залежыць будучыня чалавецтва, знаходзяцца ва ўвазе ўлады», — адзначыў ён.

Таксама патрыярх падзякаваў кіраўніку дзяржавы за стаўленне да Беларускай праваслаўнай царквы. Ён дадаў, што якасць жыцця чалавека і вызначае поспех дзейнасці палітыка. І гэта не толькі ўзровень зарплаты, але і ўсё тое, што акружае людзей.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Партнёры Меркель на выбарах у Баварыі паказалі найгоршы вынік з 1950 года

Партнёр Хрысціянска-дэмакратычнага саюза (ХДС) канцлера Ангелы Меркель па кіруючай у ФРГ кааліцыі — Хрысціянска-сацыяльны саюз Хорста Зеехофера — перамагае на выбарах у ландтаг (зямельны парламент) Баварыі, якія прайшлі напярэдадні, набіраючы 37,2 % галасоў. Такія папярэднія афіцыйныя вынікі прадставіла мясцовая выбарчая камісія. Аднак назіральнікі і СМІ называюць вынікі галасавання «правальнай перамогай», бо ХСС панёс сакрушальныя страты ва ўзроўні падтрымкі выбаршчыкаў, паказаўшы найгоршы вынік з 1950 года.

Праз два тыдні выбарныя выпрабаванні маюцца быць і самім хрысціянскім дэмакратам. Не выключана, што ў снежні Меркель з-за несуцяшальных вынікаў вымушана будзе сысці ў адстаўку, адзначае DW.

### Трамп назваў Еўрасаюз найбольш варожым саюзнікам ЗША

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп лічыць, што ні адзін з саюзнікаў Вашынгтона не паводзіць сябе так варожа ў адносінах да Злучаных Штатаў, як Еўрапейскі саюз. Пра гэта амерыканскі лідар заявіў у інтэрв'ю тэлеканалу CBS, якое было цалкам паказана ў эфіры ў нядзелю.

«Хто такі саюзнік? У нас выдатныя адносіны з вельмі многімі. Але ніхто не паводзіць сябе ў адносінах да нас настолькі дрэнна, наколькі гэта робіць Еўрапейскі саюз. ЕС быў створаны для таго, каб скарыстацца намі ў сферы гандлю, менавіта гэта яны і зрабілі», — сказаў ён.

Вядучая на гэта заўважыла, што падобныя заявы Трампа ў сваю чаргу гучаць варожа. «Ведаеце, што варожа? Тое, як яны паводзяць сябе ў адносінах да нас. Гэта не мы варожыя, а яны», — адказаў амерыканскі лідар. «Менавіта мы былі ў становішчы дурной краіны на працягу многіх гадоў», — дадаў Трамп.

### Больш за 110 тысяч чалавек пацярпелі з-за няякаснай вады ў Іраку

Колькасць людзей, якія атруціліся няякаснай пітной вадой у іракскай правінцыі Басра перавысіла 111 тысяч чалавек. Пра гэта паведамляе ТАСС са спасылкай на мясцовы партал навін Al Baghdadia.

Сярод тых, хто атруціўся, — пасол Еўрасаюза ў Іраку Рамон Блекуа. Яшчэ ў пачатку жніўня паўднёвая правінцыя краіны, дзе размешчаны самы густанаселены горад Ірака пасля Багдада, — Басра, сутыкнулася з вострай праблемай недахопу вады і перабояў з пастаўкамі электраэнергіі насельніцтву. Незадаволеныя сітуацыяй жыхары арганізавалі акцыі пратэсту, якія выліліся ў пачатку верасня ў беспарадкі і акты вандалізму, загінула не менш за дзесяць чалавек.

### У Нью-Ёрку на аўкцыёне прадалі дзве бутэлькі віна за мільён долараў



На аўкцыёне Sotheby's у Нью-Ёрку бутэлька Romanee Conti 1945 года прададзена за суму ў 558 тысяч долараў, яшчэ адна пайшла за 496 тысяч. Яны пабілі рэкорд па цане за адну бутэльку віна любога памеру, паведамляецца ў акаўнце ў Twitter аўкцыённага дома Sotheby's.

Віно было выраблена ў Бургундыі з вінаграду ўраджаю 1945 года. Усяго было выраблена не больш за 600 бутэлек віна. Дакладная колькасць бутэлек, якія дайшлі да нашых дзён, невядомая.

Пазней на аўкцыёне ў Нью-Ёрку бутэльку віскі шатландскага брэнда The Macallan ураджаю 1926 года прадалі за 843,2 тысячы долараў. Адзначаецца, што гэтая цана стала самай высокай у гісторыі Sotheby's у катэгорыі спіртных напояў, а таксама Паўночнай Амерыкі.

У маі на аўкцыёне ў Ганконгу бутэльку віскі The Macallan ураджаю 1926 года прадалі за 1,1 мільёна долараў. Усяго было выпушчана 12 такіх бутэлек. Віскі ў іх разлілі ў 1986 годзе пасля 60 гадоў вытрымкі ў дубовай бочцы.

Супрацоўніцтва

# Павялічыць тавараабарот больш чым у два разы

## Налета Беларусі і Украіне неабходна выйсці на ўзровень у 8 мільярдаў долараў

**У Гомелі актыўна ідзе падрыхтоўка да першага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны, які пройдзе 25—26 кастрычніка. Чакаецца, што ўдзел у ім прымуць кіраўнікі дзвюх дзяржаў. А напярэдадні тут, на XXVI пасяджэнні міжурадавай беларуска-ўкраінскай камісіі абмеркавалі пытанні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі і магчымасці павелічэння сумеснага тавараабароту.**

Дарэчы, сёлета па выніках 8 месяцаў ён вырас на 20 % і склаў больш за 3,5 мільярда долараў. Але ж прэзідэнтамі Беларусі і Украіны пастаўлена задача налета выйсці на ўзровень у 8 мільярдаў долараў. Намеснік прэм'ер-міністра Ігар Ляшэнка, які ўзначаліў беларускую дэлегацыю, заўважыў, што неабходна рухацца ў бок поўнай адмены бар'ераў ва ўзаемным гандлі і развіцці добрасумленнай канкурэнцыі:




— Пастаўленая кіраўнікамі дзяржаў задача патрабуе пошуку новых кропак росту, пашырэння партнёрскіх сувязяў і перспектыўных сумесных праектаў. Рэалізацыя дамоўленасцяў, дасягнутых на папярэднім пасяджэнні летась у Кіеве, спрыяла развіццю комплексу ўзаемаадносін у гандлёва-эканамічнай сферы. Разам з тым, ёсць значныя рэзервы для далейшага росту. Так, Беларусь зацікаўлена нарошчваць аб'ёмы сумеснай вытворчасці трактароў, камбайнаў для патрэб аграрнай галіны. Акрамя таго, наша краіна гатовая працягваць актыўны ўдзел у абнаўленні парку камунальнай і пасажырскай тэхнікі Украіны, адкрыта для нарошчвання супрацоўніцтва ў сферы мадэрнізацыі дарожнай інфраструктуры, прадстаўнікі беларускіх прадпрыемстваў гатовыя працаваць у сферы нафтавага сэрвісу. Самае галоўнае — мы чуем адно аднаго і бачна, што ў нас атрымаецца вырашыць гэтыя пытанні.

Віцэ-прэм'ер — міністр рэгіянальнага развіцця, будаўніцтва і ЖКГ Украіны Генадзь Зубко падкрэсліў важнасць выпрацавання планаў і перспектыў не толькі на 2019 год, але і распрацоўкі дарожнай карты на 2020—2021 гады. У якасці эфектыўнага інструмента рэалізацыі задач названа развіццё міжрэгіянальных і міжгаліновых стасункаў, кааперацыя ў розных сферах — вытворчай, транспартнай, інфармацыйнай і іншых. Генадзь Зубко адзначыў, што Беларусь застаецца надзейным партнёрам для Украіны, і задачу павышэння ўзроўню тавараабароту да 8 мільярдаў долараў можна выканаць, актыўна развіваючы стасункі ў галіне машынабудавання, энергетыкі, аграпрамысловага комплексу:

— Мы ўбачылі вузкія месцы, якія не дазваляюць нам хутка дасягнуць эфекту. У першую чаргу — гэта транспартная сувязь, тарыфы па пастаўцы і, самае галоўнае, — цэнаўтварэнне на нашу прадукцыю. Мы чакаем, што І Форум рэгіёнаў Беларусі і Украіны, на які прыедуць прадстаўнікі 13 абласцей, 60 прадпрыемстваў, пройдзе на вельмі высокім узроўні.

Больш за дзясятак пытанняў разгледжана на пасяджэнні міжурадавай камісіі ў Гомелі. Яны датычыліся развіцця воднага транспарту, будаўніцтва і архітэктуры, супрацоўніцтва ў прамысловасці і вытворчай кааперацыі, нафтахімічным сектары, энергетычнай галіне, сельскай гаспадарцы і харчовай прамысловасці, мытнай і пагранічнай сферах, а таксама ўзмацненні гуманітарнага супрацоўніцтва.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Занятасць

# ЗАЛАТЫ ЧАС ДЛЯ САІСКАЛЬНІКАЎ?

**Колькасць вакансій у краіне па-ранейшаму расце**

**Цяпер у базе налічваецца 83 тысячы прапаноў (у верасні іх было 76,6 тысячы). З іх 65 працэнтаў — па рабочых прафесіях. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя ўпаў да 0,3 працэнта.**

Самыя запатрабаваныя — кіроўцы аўто: для іх па краіне адкрыта 3,7 тысячы вакансій. Далей ідуць медсёстры і ўрачы: наймальнікам не хапае 2,9 тысячы і 2,7 тысячы спецыялістаў адпаведна. Вялікі попыт на прадаўцоў — 2,1 тысячы прапаноў. У пяцёрку самых неабходных работнікаў трапілі таксама кухары, для якіх ёсць амаль 1,5 тысячы свабодных працоўных месцаў.

У сталіцы паказчык афіцыйнага беспрацоўя складае 0,1 працэнта. **Намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Таццяна КУДЗЕВІЧ** пацвярджае: сітуацыя спрыяльная. У сталіцы штомесяц налічваецца 16—17 тысяч вакансій. Патрэба ў кадрах у параўнанні з мінулым годам вырасла на 35,6 %. Колькасць работнікаў, занятых у рэжыме няпоўнага рабочага часу, і тых, хто знаходзіўся ў водпусках па ініцыятыве наймальніка (гэта 10,3 тысячы чалавек), за год знізілася на 36,9 %, а спецыялістаў, якія прапацавалі з цэладзённымі прастоямі (22,7 тысячы гараджан), стала менеі на 36,5 %.

Калі глядзець на заробкі, якія прапануюцца па вакансіях у сталіцы, то ў сярэднім гэта 608 рублёў: 595 рублёў — для рабочых прафесій, 628 — для служачых. Большая частка свабодных рабочых месцаў (57 %) — з заробкамі ад 400 да 800 рублёў. У 27,5 % выпадкаў наймальнікі не гатовы плаціць больш за 400 рублёў у месяц. Вакансій, дзе абяцаюць ад 800 да 1500 рублёў, — 14,7 %, больш за паўтары тысячы рублёў — 0,9 %.

Што шукаюць самі мінчане?

— 70 працэнтаў беспрацоўных арыентаваны на рабочыя прафесіі, з іх кожны чацвёрты — на некваліфікаваную працу, — адзначае Таццяна Кудзевіч. Так, асаблівым попытам карыстаюцца пасады вартаўніка і вахцёра.

Для таго каб дапамагчы знайсці работу ахвотным, у сталіцы штотыднёва праводзяць тры кірмашы вакансій у аддзелах абслугоўвання грамадзян — па аўторках, серадах і чацвяргах. 15 лістапада плануецца агульнагарадскі кірмаш. Прафарыентацыйнае мерапрыемства для выпускнікоў школ чакаецца 30 кастрычніка ў Мінскім гарадскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей (вуліца Чабатарова, 6а).

У службе занятасці заўважаюць, што назіраюць нізкую ініцыятыву беспрацоўных у перанавучанні. Сёлета на курсы накіравалі значна менш грамадзян, чым у мінулым годзе, але гэта абумоўлена змяншэннем зарэгістраваных беспрацоўных. З 421 чалавека, што прайшлі навучанне ад службы занятасці ў студзені — верасні, 139 рыхтаваліся пад заказ наймальніка. З іх 70 чалавек асвойвалі прафесію кіроўцы тралейбуса (па заяўцы «Мінсктранса»), 14 — сталі дзяжурнымі атракцыёнаў і гульнявога абсталявання ў парках адпачынку, 12 — дарожнымі рабочымі. Пад заказ выпускалі таксама машыністаў электрацягніка — слесараў па рамонце рухомага саставу, кантралёра-касіра і электраманцёра.

— Але не заўсёды беспрацоўныя пры навучанні арыентаваны на заключэнне такога дагавора. Спадзяюцца, што самі змогуць знайсці лепшае месца калі атрымаюць кваліфікацыю, — заўважае **намеснік начальніка аддзела навучання ўпраўлення занятасці насельніцтва камітэта Крысціна ПЯТРОВА.** — Абавязковай адпрацоўкі пасля курсаў па большасці прафесій няма. Толькі тыя, хто вучыцца на кіроўцу тралейбуса, абавязаны адпрацаваць у «Мінсктрансе» два гады.

На перападрыхтоўку прыходзяць не толькі гараджане без прафесіі. Записваюцца і людзі з вышэйшай адукацыяй — напрыклад, калі яны не працавалі па спецыяльнасці дыплома.

З пачатку года больш за сотню мінскіх беспрацоўных атрымалі грашовую субсідыю на адкрыццё сваёй справы. Пераважна гэта мужчыны — іх сярод наваспечаных прадпрымальнікаў 59 %. Доля моладзі — 31,5 % (за год яна знізілася на 10 %). Гараджан, старэйшых за 50 гадоў, якія запускаюць бізнес з дапамогай службы занятасці, — адзінкі.

— Сярэдні ўзрост атрымальнікаў субсідыі — 35 гадоў. Напэўна, ён самы аптымальны: ёсць і вопыт, і час, каб раскруціць справу, — мяркуюць у камітэце.

На першым месцы сярод відаў дзейнасці, якія выбіраюць прадпрымальнікі, — гандаль. Папулярныя таксама будаўніцтва (апрацоўчыя, электрамантажныя работы), аўтарамонт і тэхнічнае абслугоўванне машын, цырульніцкія і камп'ютарныя паслугі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

Спорт-тайм

# ДОМА І РЫНГ ДАПАМАГАЕ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра самыя актуальныя падзеі выхадных.**

***1. Беларускія баксёры заваявалі сямнаццаць узнагарод на XVI Міжнародным турніры па боксе класа А памяці Героя Савецкага Саюза Віктара Лівенцава.*** Пераможцамі сталі Яўген Кармільчык (вагавая катэгорыя да 49 кг), Дзмітрый Асанаў (60 кг), Міхаіл Даўгалевец (81 кг), Уладзіслаў Смяглікаў (91 кг) і Вольга Лушчык (51 кг).



А наогул у міжнародным турніры прынялі ўдзел баксёры з 19 краін, ён стаў тэставым да ІІ Еўрапейскіх гульняў 2019 года.

***2. Арына Сабаленка займае 15-е месца ў абноўленым рэйтынгу Жаночай тэніснай асацыяцыі.*** Нагадаем, на мінулым тыдні, перад стартам турніру ў кітайскім Цяньцзіні, Арына была на 11-й пазіцыі, а пасля паражэння ў чвэрцьфінале апусцілася на чатыры радкі.

У першую сотню сусветнага рэйтынга ўваходзяць яшчэ тры беларускія тэнісісткі: Аляксандра Сасновіч займае 31-е месца, Вікторыя Азаранка на 56-й пазіцыі, у Веры Лапко 62-і радок.

На гэтым тыдні Аляксандра Сасновіч выступіць у Маскве ў розыгрышы Кубка Крамля. У спаборніцтвах мужчынскага парнага разраду маскоўскага турніру беларус Максім Мірны згуляе ў дуэце з аўстрыйцам Філіпам Освальдам.

***3. Футбалісты зборнай Беларусі правялі чарговыя матчы Лігі нацый.*** У суботу беларусы перамаглі каманду Люксембурга з лікам 1:0. Учора ўвечары наша каманда прыняла гасцей з Малдовы, а каманда Люксембурга згуляла на сваім полі са зборнай Сан-Марына.

Тым часам футбалісты юнацкай зборнай Беларусі (U-17) саступілі партугальцам 0:3 у кваліфікацыі першынства Еўропы. Нагадаем, раней беларусы згулялі ўнічыю з аднагодкамі з Уэльса — 2:2.

У заключным туры 16 кастрычніка зборная Беларусі будзе сапернічаць з казахстанскімі футбалістамі, якія спачатку буйна прайгралі партугальцам — 0:10, а затым адолелі валійцаў — 1:0. ***Становішча пасля двух гульнявых дзён:*** Партугалія — 6 ачкоў, Казахстан — 3, Уэльс — 1, Беларусь — 1.

Барацьбу за выхад у фінальную стадыю кантынентальнага першынства працягнуць па дзве найлепшыя дружыны з 13 квартэтаў, а таксама чатыры наймацнейшыя каманды, што занялі трэція месцы.

***4. Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова прайграў іспанскай «Барселоне» ў дамашнім паядынку групавога этапу Лігі чэмпіёнаў — 21:29.*** Пасля пяці праведзеных сустрэч у актыве БГК 4 ачкі, ён па-ранейшаму займае 6-е месца ў групе. Наступны матч падапечныя Манола Кадэнаса правядуць 4 лістапада ў Скоп'і супраць македонскага «Вардара».



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Мінскі СКА ў дамашнім матчы 2-га раўнда Кубка ЕГФ абыграў партугальскі «Порту» з лікам 25:24. Аднак гэта не дазволіла армейцам прайсці далей з-за паражэння на выездзе з розніцай у пяць мячоў — 29:34.

***5. Хакеісты «Дынама-Мінск» саступілі ў авертайме чарапавецкай «Поўначсталі» з лікам 1:2 у чэмпіянаце Кантынентальнай хакейнай лігі.*** Дамашнюю серыю матчаў у чэмпіянаце КХЛ мінскае «Дынама» завершыць сёння сустрэчай з аднаклубнікамі з Масквы.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# КАСТРЫЧНІК У МАІ






*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паварот на вёску пазначаны дарожным указальнікам, і прамінуць яго немагчыма. Як расказваюць сталыя жыхары — а жывуць цяпер у вёсцы пенсіянеры і дачнікі, назва Май — спадчына эпохі пераўтварэнняў і перайменаваннняў дасталася былой вёсцы Дзюрдзева яшчэ ў 1925 годзе. Але майскіх жыхароў і сёння часам называюць па-ранейшаму — дзюрдзеўцы. І ў гэтым ёсць своеасаблівы знак роду, радзімы. Такімі думкамі са мною падзяліўся найстарэйшы жыхар і адзіны вясковы музыкант Іван Ярац. Івана Савельевіча лічаць добрым гаспадаром: у свае восемдзесят два ён трымае каня, лёгка спраўляецца з гаспадаркай і за доўгае жыццё не згубіў аптымізму.

Кастрычнік у Маі, як і ў кожнай беларускай вёсцы, — не толькі прыгожая пара года, але і адказны час. Людзі рыхтуюцца да зімы: пераворваюць агароды, зносяць у склеп ураджай бульбы, гарбузоў і яблыкаў, лічаць куранят ды іншую свойскую птушку і жывёлу. У пенсіянераў Аляксандра і Галіны Гарманенкаў спраўная гаспадарка — атара авечак, чарада гусей, трусы. Двор і пляцоўка перад сядзібай — узор дбайнай руплівасці, працавітасці і культуры. Сёлета Гарманенкі адзначылі сваё шлюбнае 39-годдзе. А яшчэ Аляксандр — школьны сябар паэта Анатоля Сыса, разам хадзілі ў Заспенскую школу.



«Май — мая Бацькаўшчына, тут прайшло маленства і юнацтва», — зазначае Аляксандр. А яго другая палавінка, Галіна, працягвае: «На зямлі трэба працаваць, падтрымліваць парадак, але сама прырода, цішыня і чыстае паветра даюць нам сілы і сапраўдную асалоду!»

Па-суседству з Гарманенкамі жыве былы маракфлотавец, а цяпер — агароднік-садавод Аляксандр Дзімітраў. Ён не спяшаецца з'ехаць у горад, бо на папячэнні гадавалая козачка, ды і не ўсе яблыкі і грушы зняты з дрэў. Пяць гадоў, як параднілася з маёўцамі сям'я дачнікаў Паддубных з Рэчыцы. Рыгор і Наталля купілі дом на краі вёскі і з вясны да восені праводзяць тут час. Іхнія дзеці Максім і Таццяна ўзялі на сябе клопат пра зямлю і ўраджай.

Аляксандр Булавецкі, Надзея Богуш і яе сястра Кацярына, Зінаіда Болева, якіх я сустрэў, наведваючы кастрычніцкі Май, — пенсіянеры. Восень жыцця яны таксама сустракаюць на сваёй малой радзіме.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**





Надвор'е

## ДНЁМ ЯШЧЭ — ЛЕТА

### Але ўначы і раніцай амаль усюды холадна, дзе-нідзе — замаразкі

**Шырокі антыцыклон, цэнтр якога зараз размяшчаецца над паўночным усходам Украіны, на працягу тыдня працягне аказваць уплыў на надвор'е ў нашай краіне. Таму ў нас захаваецца цёплае без ападкаў надвор'е, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Такім чынам сёння днём будзе без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра чакаецца ад плюс 15 да плюс 20 градусаў. У сераду і чацвер, ужо ў другой палове кастрычніка, будзе без ападкаў і цёпла днём, як у пачатку чэрвеня. Праўда, уначы і раніцай у асобных раёнах згусціцца халодны туман. Тэмпература ўначы — ад нуля да плюс 7 градусаў. Месцамі на тарфяніках замаразкі да мінус двух градусаў. Удзень будзе добра прыпякаць і ўсталюецца ад плюс 15 градусаў да 22 цяпла. У пятніцу прагназуецца пераважна без ападкаў, але згусціцца воблачнасць. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. У начны час надвор'е стане мякчэйшае — будзе 3—8 цяпла, а ўдзень стане халадней і ўсталюецца ад плюс 13 да плюс 18 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя дні надвор'е пачне мяняцца. У суботу ўдзень цераз тэрыторыю краіны будзе перамяшчацца атмасферны фронт. І хоць дажджоў будзе няшмат, за фронтам пачне паступаць больш халоднае паветра з паўночных шырот. Так што ў выхадныя дні істотна пахаладае. Трэцяя дэкада кастрычніка...

**Сяргей КУРКАЧ.**

## РАТАВАЛЬНІКІ ПАЧЫНАЮЦЬ РЭЙДЫ

**З 15 кастрычніка да 2 лістапада ў Беларусі абвешчана акцыя «За бяспеку разам!». Яе праводзіць Міністэрства па надзвычайных сітуацыях разам з прадстаўнікамі іншых ведамстваў.**

— Мы будзем дапамагаць адзінокім і адзінока пражываючым пажылым грамадзянам, інвалідам, сем'ям, у якіх дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, і іншым людзям, каб прывесці іх дамы і кватэры ў бяспечны стан, — адзначаюць у МНС.

Ратавальнікі нагадваюць, што адказнасць за выкананне патрабаванняў пажарнай бяспекі ў прыватных жылых дамах ускладзена на іх уласнікаў.

Далучыцца да акцыі можа кожны чалавек. Для гэтага трэба праверыць, як працуюць аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі. А калі гэтага маленькага прыбора ў вашай хаце яшчэ няма, то абавязкова яго ўсталюйце. Таксама праверце, ці спраўна працуе электрычная праводка і сістэма ацяплення.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Подыум

# «ДАЎНО МАРУ ПАБЫВАЦЬ НА ПАКАЗЕ»

## Як дзяўчаты з асаблівасцямі развіцця ўпершыню ствараюць модную калекцыю

**У лістападзе ў Мінску пройдзе Беларускі тыдзень моды. Звычайна ў ім удзельнічаюць дызайнеры, што ўжо паспелі заявіць пра сябе. Але сёлета будзе выключэнне. Адну з калекцый разам з мадэльерамі ствараюць дзяўчаты і жанчыны з інваліднасцю, для якіх гэты модны паказ — першы ў жыцці. Мы папрасілі некалькі ўдзельніц расказаць пра свае работы, гардэроб, безбар'ернае асяроддзе ў горадзе і мары.**


Юлія ЛІСЕЦКАЯ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

### «ХАЦЕЛА Б НАСІЦЬ КАРОТКІЯ СУКЕНКІ»

**Юлія ЛІСЕЦКАЯ** робіць для калекцыі вышыўку. Вуаль, якая пойдзе на фартух, упрыгожыла кізільнікам з пацерак, на манжэтах будучага касцюма змясціла «чмялёў». Працаваць рукамі яна вучылася ў Мінскім цэнтры дэкаратыўна-прыкладной творчасці, дзе атрымала дыплом вышывальшчыцы.

— Калі збіралася вучыцца ў цэнтры, бацькі казалі: «Навошта туды? Трэба ў інстытут ісці, вышэйшую адукацыю атрымліваць». Пазней я паступіла ў Інстытут сучасных ведаў імя Шырокага на дызайнера. Але здароўе пагоршылася, і я сышла.

У мяне эпілепсія, для большасці наймальнікаў гэта адразу «не». Маё першае месца работы — прадпрыемства «Скарбніца». Там вышывала па трыкатажы. Потым была кур'ерам шэсць гадоў, дакументы вазіла. Цяпер другі год працую ў «АртІдзі» — мяне ўзялі з біржы па праграме працоўнай адаптацыі. Нядаўна перавялі на пасаду майстра вытворчасці аддзела — курырую іншых работнікаў. Заробак тут невялікі, але мне яшчэ плацяць пенсію па інваліднасці.

Я ўмею вязаць, габелены рабіць, пэчварк асвоіла. Сябры ўсё просяць у падарунак ім што-небудзь змайстраваць, але часу не хапае.

Модай не захапляюся, адзяваюся на свой густ. У мяне фігура нестандартная, сукенкі кароткія не магу насіць — а так хацелася б... Таму ў гардэробе штаны ў асноўным.

У вольны час у музеі хаджу. Была ў музеі Янкі Купалы, Нацыянальным мастацкім. Нядаўна ў Налібоцкую пушчу ездзіла.

Бацькі вельмі рады, што я ўдзельнічаю ў модным праекце, толькі перажываюць, што шмат часу губляю і выхадных няма. Дызайнеры маёй працай задаволены, а я крытычна да сябе стаўлюся: хацела б лепшую якасць.

### «ШЭСЦЬ ГАДОЎ ВЫРАБЛЯЮ ЎПРЫГАЖЭННІ»

Многія дзяўчаты, якія дапамагаюць ствараць калекцыю, жывуць у рэгіёнах — Мазыры, Жодзіне. **Ганна ГАНІСЕЎСКАЯ** — са Стоўбцаў. Вязаныя шыдэлкам манжэты і беражкі — яе рук справа.

— На модных паказах ні разу не была, але даўно мару, таму, калі мне прапанавалі далучыцца да праекта, з радасцю пагадзілася. Гэта магчымасць пазнаёміцца з мадэльерамі, паказаць сваё здольнасці. У «Інстаграме» я падпісана на многіх беларускіх дызайнераў. З цікавасцю сачу, напрыклад, за Юліяй Латушкінай. Мне падабаецца стыль «кэжуал» — максімальна зручныя рэчы.

Ужо шэсць гадоў я вырабляю ўпрыгажэнні. Удзельнічаю ў кірмашах, фестывалях — і ў родным горадзе, і ў Мінску. Некаторыя нашы славутасці робяць у мяне заказы. Ганна Шаркунова некалькі разоў прыязджала, Вольга Хіжанкова была — ёй вельмі спадабаліся мае бранзалеты.

Колькі часу ідзе на выраб аднаго ўпрыгажэння, залежыць ад складанасці. Бывае і тыдзень патрэбны. Шмат часу адводзіцца на заказ матэрыялаў, падборку інструментаў.

У мяне спінальная цягліцавая атрафія. Таму на вучобу хадзіць не магу. Дома размаўляю праз інтэрнэт з сябрамі, слухаю аўдыякнігі. Сярод любімых аўтараў — Рэмарк. З сучасных — Барыс Акунін: я яго вялікая фанатка.


Вуаль з вышытымі чмялямі.


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

З безбар'ерным асяроддзем у Стоўбцах не ўсё ідэальна, але з кожным годам з'яўляюцца пандусы, пляцоўкі. У Дом культуры можна трапіць, у некаторыя крамы таксама. Я нядаўна атрымала электракалляску, часцей на шпацыры бываю.

### «ГЭТА АДНА З НАЙЛЕПШЫХ ПАДЗЕЙ У МАІМ ЖЫЦЦІ»

Ажурныя ўстаўкі на спінку адзення, рушы для блузы, пояс вяжа **Святлана ПЯТРОЎСКАЯ.** Жанчына рукадзельнічае яшчэ са школьнай лаўкі.

— Некалі я была зарэгістравана як рамеснік, але тады яшчэ не так развіты быў інтэрнэт, і ўсё павісла ў паветры. Цяпер вяжу толькі для сябе і блізкіх: шапкі, шалікі, пульсэткі, кардыганы, світары. На прутках і шыдэлкам.

Мне падабаюцца рукадзельныя форумы, гляджу, што ў гэтым сезоне запатрабавана. Сёння, напрыклад, модныя вялікія аб'ёмныя косы, каб па 12 петляў перапляталася.

Я не працую па стане здароўя. На жаль, гадоў пяць таму здарылася праблема з пазваночнікам, і я захрасла дома. Па кватэры хаджу, але на вялікія адлегласці перасоўвацца вельмі складана, бо мне трэба часта адпачываць.

Дзе дагэтуль працавала? А можна не ўспамінаць мінулае? Я так старалася яго забыць...

Акрамя вязання люблю пячы хлеб. Фільмы добрыя гляджу: «1+1», «Дыхай дзеля нас» — у маю тэму. Савецкае кіно люблю. Па канале «Рэтра ТБ» з задавальненнем уключаю фільмы 60—70-х гадоў.

Калі прапанавалі працаваць над моднай калекцыяй, я за гэту магчымасць ухапілася. Перш за ўсё таму, што хацела адчуць сваю запатрабаванасць. Мне прыемна, што мая работа спадабалася і будзе выкарыстана на такім узроўні. І, зразумела, спадзяюся нейкую капейчыну дадаткова да пенсіі атрымаць.

Хутчэй за ўсё, на паказ прыйсці не змагу. На такім мерапрыемстве трэба выглядаць прэзентабельна, а калі баліць пазваночнік — гэта складана, бо думкі зусім пра іншае. Буду прасіць, каб мне скінулі фота.

Я ўсцешана, што маю працу пакажуць на подыуме, што хаваць. За апошнія пяць гадоў гэта, бадай, адна з самых вялікіх падзей у маім жыцці, якая дае ўнутраныя сілы.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**


Рэч з будучай калекцыі (спінка выраба).

**Праект «Новыя магчымасці» рэалізуе Беларуская палата моды сумесна з Беларускай асацыяцыяй дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам. Аснову калекцыі распрацоўвалі дызайнеры Павел Доўнар (вядомы па брэндзе «Honar»), Аляўціна Расолька, Вольга Бігель і Ева Селіванава. Лейтматывам сталі рэдкія насякомыя і расліны, занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі. Усяго на подыуме прадставяць больш за 20 модных вобразаў.**

**Арганізатары спадзяюцца, што гэты праект стане штуршком да нечага большага. Дызайнеры і тэкстыльныя прадпрыемствы ўбачаць, што майстры з інваліднасцю могуць ствараць прыгожыя і якасныя вырабы, і будуць даручаць ім асобныя заказы (тым больш многія работы можна выконваць дома).**

---

# Кінафестываль «Лістапад» абвясціў фільм адкрыцця

**Юбілейны 25-ы «Лістапад», цырымонія адкрыцця якога адбудзецца 2 лістапада ў кінатэатры «Масква», стартуе з карціны польскага рэжысёра Паўла Паўлікоўскі «Халодная вайна». Чорна-белая, з незвычайным квадратным фарматам і прыватнай гісторыяй на фоне гістарычных пераломаў меладрама ўжо прынесла яе аўтару ўзнагароду Канскага кінафестывалю як найлепшаму рэжысёру і вылучэнне на «Оскар» ад Польшчы.**



Беларускі глядач памятае папярэднюю карціну польскага рэжысёра — оскараносную «Іду», якая ў 2013 годзе атрымала «золата» і «серабро» «Лістапада», гэта значыць дзве галоўныя яго ўзнагароды.

«Халодная вайна» — гэта love-story інтэлігентнага дырыжора фальклорнага ансамбля Віктара і неадукаванай артысткі ансамбля Зулы — гэтак жа, дарэчы, звалі бацькоў Паўла Паўлікоўскі, якім прысвечаны фільм. На фоне пасляваеннай камуністычнай Польшчы, у Варшаве, Берліне, Югаславіі, Парыжы, з усімі супярэчнасцямі часу, якія ўмешваюцца ў жыццё герояў, з джазам і фальклорнымі матывамі Віктар і Зула дзесяцігоддзямі то знаходзяць адно аднаго, то губляюць.

«Адкрыць 25-ы «Лістапад» карцінай «Халодная вайна» — для нас сімвалічны жэст, бо таксама, як наш фестываль, фільм Паўла Паўлікоўскі кажа аб галоўнай праблеме, уласцівай камуністычнаму лагеру, а цяпер ужо посткамуністычнай прасторы, — супрацьстаянню Усходу і Захаду. Фільм сапраўды адлюстроўвае існаванне двух светаў і дзвюх сістэм, але па сутнасці «Халодная вайна» — не палітычнае кіно. Карціна кажа пра тое, як гэтыя граніцы хочацца сцерці, як хочацца жыць і любіць, як неабходна адчуваць свабоду. Яна падымаецца над ідэалогіяй, палітыкай, соцыумам, што перашкаджаюць людзям быць шчаслівымі», — гаворыць **праграмны дырэктар «Лістапада» Ігар СУКМАНАЎ.**

У карціне можна пачуць як дэкадэнцкі для нашых 1950-х джаз, так і «Кантату пра Сталіна». Убачыць як жорсткую сістэму — «жалезную заслону», абвінавачанне ў здрадзе, лагер, так і рамантычную гісторыю кахання. Як сцвярджае, знакі часу і гістарычны кантэкст, так і спазнаць універсальную гісторыю.

Заснавальнікамі «Лістапада» выступаюць Міністэрства культуры і Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. Арганізатарам — Цэнтр візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «АРТ Карпарэйшн».

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 06.11.2018 года в 11.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 50 % после вторых несостоявшихся торгов по продаже имущества, принадлежащего Республиканскому унитарному предприятию «Производственное объединение «Белоруснефть» на праве хозяйственного ведения

| № лота | Инв. № | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, рублей (без НДС*) | Задаток, рублей (без НДС*) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1141 | Машина плосковязальная TECHNOT EX кл.10 | Предназначена для изготовления изделий регулярным (вывязывание по контуру) и полурегулярным (с подрезкой) способами. Машина-автомат с программным управлением, подключение 380 V | 1 079,21 | 108,00 |
| | | | | * без НДС согл. п. п. 2.3 п. 2 ст. 93 НК РБ | |

Местонахождение имущества: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, головные сооружения РУП «Производственное объединение «Белоруснефть»

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 5 ноября 2018 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 11.00 **6 ноября 2018 г**. Продавец вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Аукционные торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12 июля 2013 г. № 609. **Шаг аукциона – 5 %.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %.

І я жыву. Сонная мара, здань, смуткуючая душа...

Вы пытаеце, што ж здарылася? А нічога. Проста самы блізкі мне чалавек стаў самым далёкім, як халоднае сонца на зімовым небасхіле. Хмара пад назвай «здрада» зрабіла крывавым маё блізкае і адначасова далёкае сонца. Ды не буду тлуміць вам галаву, мае нашчадкі. Аб усім па парадку.

Я — звычайная сялянская дзяўчына з мястэчка Мір. Завуць мяне Кася. Бацькі мае — людзі простыя, працавітыя. Як звычайна, дзяцей у хаце многа, а зямлі сваёй мала. З гэтай прычыны бацькі бралі мяне, як старэйшую, і ішлі ў заробкі да мясцовага магната. Матуля мая, жанчына ў мястэчку вельмі паважаная і акуратная, добрая майстрыха, навучыла мяне шыць, вышываць, карункі плесці, гатаваць далікатна і смачна. Ці ж думала яна, што веды гэтыя не жыццё маё палепшаць, а да гвалтоўнай смерці давядуць?

У тыя часы нашымі землямі і мястэчкам валодаў магутны шляхецкі род Іллінічаў. Менавіта яны і пабудавалі недалёка ад мястэчка каменны замак. І пакуль бацька абрабляў землі, мы з матуляй былі ў самім замку: цягалі ваду і дровы, апрацоўвалі садавіну і агародніну, мяса і рыбу. Хаця кухонных служак было шмат, праца ўсё адно была цяжкая і вольныя рукі ўвесь час былі патрэбныя. Маці дапамагала галоўнаму кухару гатаваць стравы для гаспадара і яго гасцей і мяне трымала каля сябе. Цяжкай працы я не баялася і ніколі не сумавала. Я спявала. Ад спеваў маіх на тварах гэтых спрацаваных жанчын узнікалі ўсмешкі і ажывала надзея, што некалі будзе лягчэй.

Аднойчы спевы мае пачуў сам гаспадар замка — Станіслаў Ілліініч. Ён спусціўся ў гаспадарчыя каморы, каб паглядзець, хто ж гэта спявае.

Трэба сказаць, што шляхціч наш быў вельмі сабою гожы: высокі, статны, валасы чорныя як вугаль і вочы такія ж. Здавалася, што, глянуўшы ў іх глыбіню, можна патануць. А ўсмешка! Адкрытая, шчырая і адначасова загадкавая, якая без слоў клікала за сабою...

Паклікаў Станіслаў мяне якраз словамі. І я пайшла. Бо я — сялянка. А ён — мой гаспадар. У той момант сэрца заходзілася ад страху. Першыя думкі былі самыя дрэнныя — што не так я зрабіла, што магла выпадкова пашкодзіць, дзе не справілася? Станіслаў, прывёўшы мяне ў гасцёўню, проста спытаў, хто я і адкуль.

— Кася? Такое простае імя для такой прыгажуні? — здзівіўся ён. — І ўсё ж гэта — самае лепшае імя.

Словы Станіслава запалі мне ў самае сэрца. У той дзень мы больш не сустракаліся. Але я адразу зразумела, што закахалася. Душа мая ад хвалявання вырывалася з грудзей і трапяталася, як злоўленая птушка. Думкі перапаўнялі згадкі пра Станіслава. Вочы не бачылі нічога і нікога, яны шукалі толькі каханага.

Бацькі хутка здагадаліся, што са мною і хто таму прычына. Каб вы чулі, як плакала мая маці! Бацька пастарэў на вачах. Яны прасілі мяне адумацца, выкінуць каханне да шляхціча з галавы і сэрца, паглядзець на мясцовых хлопцаў, з якімі ў мяне магла быць сумесная будучыня. Бацька забараніў маці браць мяне ў замак на працу, а мне забараніў нават здалёк на замак глядзець.

Скажыце, ці заўсёды вы слухаеце бацькоў сваіх, калі кахаеце? Пэўна ж, не. Я таксама не паслухала... Тым больш што сам Станіслаў, як аказалася, шукаў сустрэчы са мною. У адзін з летніх дзянькоў, калі я была дома, ён спыніў каня каля бацькоўскіх весніц...

Што было далей, вядома ўсім закаханым. Ды і я больш не хачу рваць на часткі сваю пакутную душу гэтымі ўспамінамі. Скажу адно: сустрэчы нашы спачатку былі таемныя, а пасля Станіслаў забраў мяне ў замак. Не пыталася я дазволу ў бацькоў быць з ім, а Станіслаў маіх бацькоў тым больш не пытаўся.

Жыла я ў замку і не жонкай, і не служанкай і вельмі позна зразумела ўсю глыбіню свайго падзення. Разуменне гэтае прыйшло як маланка ў ясны дзень: пад маім сэрцам нарадзілася новае жыццё.

Ну а што зрабіў мой дарагі каханы, даведаўшыся аб гэтай навіне, спытаеце вы? Не, ён не ажаніўся са мною. Станіслаў выдаў мяне замуж за свайго служку Навіцкага, забяспечыўшы такім чынам прозвішча мне і майму яшчэ не народжанаму дзіцяці. Я не магла паверыць, што Станіслаў не кахае мяне, што ён мне здрадзіў. Чароўная ўсмешка аказалася «ўсмешкай змяі»...

Муж мой Навіцкі ніколі ні словам ні ўчынкам не абразіў мяне і дзіця, быў добрым гаспадаром і бацькам. Але я не бачыла гэтай дабрыні. Я палала нянавісцю да былога каханага. Нянавісць гэтая спапяліла мяне, калі ў замку было аб'яўлена аб жаніцьбе Станіслава на шляхцянцы са знатнага роду.

Падчас аднаго з баляванняў я непрыкметна падмяшала атруту ў віно, а сама стаяла і назірала, як Станіслаў, выпіўшы яе, пасінелымі ўмомант вуснамі спытаў: «За што?»

Толькі аб адным я пашкадавала ў той момант. Я не знайшла атруту, якая забівала б марудна. Тады, магчыма, Станіслаў змог бы сам адказаць на сваё пытанне і зразумець, што нельга крыўдзіць чалавека, які цябе кахае.

Схапілі мяне недалёка ад замка, ды я і не хавалася. Прысуд быў кароткі — спаліць жывою. Здзейсніў гэты ўчынак брат Станіслава Шчасны. Але нават калі языкі полымя ахапілі мае ногі, я не пашкадавала аб сваім учынку.

Ды, відаць, сам Бог мяне пакараў. Душа мая не атрымала супакою ні ў чысцы, ні ў пекле. За здзейсненае нябёсы адракліся ад мяне. І хаджу я нябачнай зданню ў сутарэннях Мірскага замка, шукаю збавення, якога няма.

Моліцца за мяне толькі муж мой Навіцкі і дзіця маё адзінанароджанае. Ды, мусіць, мала іх малітвы...»

*На гэтым ліст Касі абрываецца. А ў вас, паважаныя чытачы, узніклі, напэўна, самыя розныя пачуцці. Для некага — гэта проста прыгожае паданне, хтосьці атрымаў глебу для разважання і асэнсавання асабістага жыцця і жыцця ўвогуле, у кагосьці ўзнікла шмат хвалюючых пытанняў. На ўсе вашыя пытанні ёсць адказы ў сценах цудоўнага і таямнічага Мірскага замка... Пані Гісторыя і пані Легенда чакаюць Вас!*

**Вольга ДАВІДЗЕНКА.**

Практычнае радзімазнаўства

# «ЗЯЛЁН ЯВАР, ДУБРОВА»

## Музыка Полаччыны ад палачан

**Полацкі фальклорны гурт «Варган» прэзентуе дэбютны альбом з музыкай роднай зямлі. У яго ўвайшлі песні і інструментальныя кампазіцыі, якія некалі гучалі на тэрыторыі Полаччыны на працягу гадавога каляндарнага кола. Кружэлка прызначана для аматараў этнічнай музыкі і беларускага фальклору.**



«Зялён явар, дуброва. Музыка Полаччыны», першы студыйны альбом «Варгана», змяшчае 18 трэкаў, сярод якіх песні, танцы і нават «цярэшкі». У якасці бонусу — запіс купальскай песні ад аўтэнтычнай спявачкі Алімпіяды Міхайлаўны Шчарбаковай з вёскі Шастова Полацкага раёна.

У выкананні «варганцаў» можна пачуць абрадавыя песні, прымеркаваныя да знакавых гадавых свят, а таксама лірычныя — жаночыя ды мужчынскія. Раней песня ішла з чалавекам праз усё жыццё. Песняй сустракалі пры нараджэнні, яна дапамагала ў цяжкай працы і ў нялёгкіх жыццёвых абставінах. На кожным свяце гучалі асобныя песні, унікальныя ў кожным рэгіёне і нават вёсцы. Спявалі ў хаце, у полі, у дарозе.

Вясковы свет не быў глухім і шэрым захалусцем, як і людзі не былі сумнымі і замучанымі рабацягамі. Бо не працай адзінай жыў чалавек. Нашыя продкі ўмелі і любілі весяліцца. Як доказ — інструментальная частка альбома, што пераносіць слухача на сапраўдную вясковую вечарыну з танцамі. Гармонік ды скрыпка, цымбалы ды бубен, дуда ды колавая ліра і канешне ж — варган. Так, сапраўды, на дыску можна пачуць гукі гэтага старажытнага інструмента. І гэта не нейкія фантастычныя разважанні на тэму. Мала хто ведае, але ў Полацку гралі на варганах з ранняга сярэднявечча. Гэта пацвярджаюць археалагічныя знаходкі. Ды і назву гурт абраў сабе невыпадкова. Варган для спевакоў сімвалізуе своеасаблівы «партал», які дазваляе вандраваць у прасторы і часе і паглыбляцца ў гукавую стыхію мінулых стагоддзяў.

У стварэнні інструментальнай часткі альбома прымалі ўдзел запрошаныя музыкі — вядомы майстар, музыка і мастак Алесь Лось (дуда, колавая ліра), а таксама Алеся Сівохіна (цымбалы).

«Наша мэта — стварыць жывы музычны вобраз Полаччыны, прапусціўшы аўтэнтычны матэрыял праз сваё сэрца, прадэманстраваць тую палітру гукаў і эмоцый, якія несла ў сабе гэтая музыка», — кажуць удзельнікі гурта. Спрабуючы дакрануцца да ўнікальнай музычнай традыцыі Полаччыны, удзельнікі «Варгана» імкнуцца максімальна наблізіцца да аўтэнтычнай манеры выканання і перадаць яе жывую энергетыку.

Гучанне альбома стварае атмасферу, набліжаную да палявога запісу ў час свята, вечарынкі, ігрышча. Частка кампазіцый запісвалася ў Полацку (запіс, звядзенне — Алесь Лось), частка — у Мінску (запіс, звядзенне, мастэрынг — Арцём Петрашкевіч і Валерый Бяляеў). Дызайн вокладкі стварала Святлана Клепікава.

Прэзентацыя альбома «Зялён явар, дуброва. Музыка Полаччыны» ў Віцебску адбудзецца 20 кастрычніка.

Альбом выйшаў у межах праекта «Традыцыя», у якім раней пабачыў свет дыск «Мужчынская традыцыя спеву» і «Вясельныя песні і найгрышы вёскі Лявонпаль і яе наваколляў».

**Варвара ГОМАН.**

Постаці

# ЛІРНІК ВЯСКОВЫ



*Будзеш жыць! Будуць векі ісці за вякамі, —*
*Не забудуцца дум тваіх словы,*
*Як і слоў беларускіх, жывучы між намі,*
*Не забыўся ты, лірнік вясковы...*

Гэтыя радкі Янка Купала прысвяціў Уладзіславу Сыракомлю. Пясняр называў Сыракомлю першым у спісе паэтаў, якія аказалі на яго найбольшы ўплыў.

Пра жыццё і творчасць паэта раскажа экспазіцыя літаратурнага музея ў Смольгаўскай школе Любанскага раёна. У школьным двары ўстаноўлены памятны камень, а на сцяне будынка — памятная дошка: «У в. Смольгаў нарадзіўся беларуска-польскі паэт Уладзіслаў Сыракомля (Людвік Кандратовіч) 29.09.1823 — 15.09.1862».

Псеўданім Сыракомля паэт узяў у знак павагі да радавога герба сямейства Кандратовічаў. Такі герб, выразаны на дрэве мясцовымі ўмельцамі, і мноства іншых экспанатаў — архіўных здымкаў, друкаваных выданняў, копій рэдкіх дакументаў — прадстаўлены ў экспазіцыі музея земляка, паэта-патрыёта, краязнаўца, перакладчыка, майстра баладна-гутарковай формы.





У жанры «народная гутарка» (так пазначыў сам аўтар) напісаны яго вядомы твор «Паштальён». У розных краінах гэты запісаны паэтам расказ ведаюць як папулярную рускамоўную песню «Когда я на почте служил ямщиком».

Працы Сыракомлі перакладалі ў розныя часы мінулых стагоддзяў, у яго гонар названыя вуліцы ў Мінску, Навагрудку, Нясвіжы, Стоўбцах, Вільнюсе, Варшаве.

Вельмі актуальным зваротам для ўсіх пакаленняў на ўсе часы гучыць сёння напісанае Уладзіславам Сыракомлем у 1857 годзе: «Ганебны сорам не ведаць усёй зямлі, на якой мы жывём, або яшчэ горш, ведаць лепш чужыя краіны, чым сваю».

Гэтымі днямі на малой радзіме паэта і ў Любані праводзіўся круглы стол «Малая радзіма Уладзіслава Сыракомлі: 195-годдзе з дня нараджэння», арганізаваны ўпраўленнем па адукацыі, спорце і турызме Любанскага райвыканкама, Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі пры ўдзеле Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.**








**Здымкі зробленыя ў вёсцы Смольгава. На фота — некаторыя экспанаты ўнікальнага школьнага музея, яго інтэр'ер. Адзін са здымкаў знаёміць з Палінай НЕМАЛЬЦАВАЙ — вучаніцай Любанскай школы № 3. Дзяўчына прадстаўляе распрацаваны даследчы праект «Малая радзіма «Лірніка вясковага»». Гэты праект — вынік вывучэння літаграфій Напалеона Орды, матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, перапіскі з нашчадкамі паэта.**

Сенсацыя?

# А ІМЯ ЯМУ — ГЕОРГІЙ

**Археолагі знайшлі імавернае месца пахавання бацькі Ефрасінні Полацкай**

**Сёлета археолагі, якія даследуюць Спаса-Праабражэнскую царкву і прылеглую да яе тэрыторыю, адшукалі падземны храм-пахавальню, аналагаў якому на ўсходнеславянскай прасторы няма, паведамляе сайт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (студэнты і выкладчыкі гэтай установы прымаюць у раскопках самы непасрэдны ўдзел).**

Аб'ект сапраўды ўнікальны, сцвярджаюць даследчыкі. Гэта невялікі падземны храм — ніжні ярус асобнай пабудовы, якая была ўзведзена непасрэдна каля сцен Спаскага сабора адначасова з галерэяй з той жа цэглы (плінфы), што і сцены самога храма. Падобныя падземныя пахавальныя збудаванні амаль невядомыя на тэрыторыі Старажытнай Русі. Ён быў пабудаваны як пахавальня адной асобы, можа быць, дзвюх, калі іх пакласці ў гэтую нішу разам. Сама ніша невялікая, усяго каля 1 метра 40 сантыметраў даўжынёй і глыбінёй 50 сантыметраў. Хутчэй за ўсё, будавалася яна ўжо не для таго, каб пакласці цела, а для таго, каб прынесці туды з месца першапачатковага пахавання нейкія мошчы.

Пакуль саму нішу археолагі не ўскрылі — раскопкі вядуцца літаральна па сантыметры, каб не прапусціць ніводнага артэфакта. Але ёсць меркаванне, што ў яе прападобная Ефрасіння перанесла мошчы свайго бацькі, полацкага князя Георгія, які быў высланы кіеўскім князем у Канстанцінопаль і скanaў на чужыне. Каму яшчэ асветніца магла аддаць такую пашану?

«У адрозненне ад вялікіх князёў літоўскіх і князёў кіеўскіх, пра месцы пахавання полацкіх уладароў мы не ведалі нічога, — гаворыць **Аляксей КОЦ, старшы выкладчык кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржуніверсітэта.** — Сёлета работа паступова ўжо згортваецца. Але мы чакаем, што пры адкрыцці пахавальнага аркасолія ў падземным храме мы ўсё ж зможам знайсці парэшткі аднаго з полацкіх князёў — князя Святаслава-Георгія — бацькі Ефрасінні Полацкай. Калі такое здарыцца, то гэта будзе «бомба» ў свеце гісторыі і археалогіі!»

**Эмілія ШЭЛЕСТ.**

Сваімі словамі

# ШАЛАШ СЯРОД ЗАЛАТЫХ ДРЭЎ



**Ёсць такая сучасная прыказка: «Зімой занадта холадна, каб рабіць тыя справы, якія летам было рабіць занадта горача». Жарты жартамі, але задумайцеся, ці не так мы сапраўды часам жывём? Праўда, цяпер восень — і гэта добрая нагода пагаварыць менавіта пра яе.**

Асабіста я пахмурным лістападаўскім днём неяк магла зладзіць сябе на думцы, што прыгожую, залатую, чырвоную восень я прапусціла... Дрэвы афарбоўваюцца ў такія яркія, прыгожыя колеры не на працяглы час. Прабягаеш міма, спяшаешся на працу ці па нейкіх іншых пільных справах і хіба што бакавым зрокам заўважаеш, што навокал жоўта і чырвана... У кагосьці з сяброў на старонках у сацыяльных сетках пабачыш асеннiя фота і подпіс пра тое, як жа прыгожа навокал! Праходзіць тыдзень, два, тры — моцная залева, вятры — і няма больш на дрэвах іх залатых куртак. Што рабіць? Цэлы год чакаць, каб пабачыць прыроду такой самай найпрыгажэйшай парой...

Пра сябе скажу, што сёлета я ўбачаным больш-менш задаволеная. Не буду далёка назад забягаць, але пачалося ўсё яшчэ ўзімку з вандроўкі па карпацкіх заснежаных горах і з блукання ў беларускіх сталічных снежных завеях — зіму я тады адчула напоўніцу. Што праўда, вясна была не такой яскравай — але ў Батанічны сад у час цвіцення бэзу і некаторых іншых дэкаратыўных кустоў я завітала — і гэта ўжо, лічы, плюс у гісторыі. Летам я пайшла ў адпачынак на цэлы месяц і свядома не паехала да мораў-акіянаў, вырашыўшы, што трэба атрымаць асалоду ад мясцовай прыроды і вольнага часу, праведзенага з роднымі.

І вось адны з мінулых выхадных ужо адкрылі мне сапраўдную залатую восень! Мы сабраліся ў сяброў, якія жывуць у вёсачцы за 30 кіламетраў ад Мінска. Такая ціш стаіць, проста неверагодная! І паветра, як толькі выходзіш з машыны, адразу ледзь не кружыць галаву сваёй свежасцю і чысцінёй. Пабыўшы там два дні, я нагледзелася і налюбавалася (хаця гэтага рэдка бывае дастаткова). Вялікі чырвона-жоўты клён, які расце на схіле. Даволі надзейны шалаш, зроблены мясцовымі хлапчукамі пасярод ужо жоўтых дрэў. Стройныя, высокія кусты сіне-фіялетавых кветак — нідзе ў горадзе не бачыла такіх, а там растуць проста на кожным кроку. Спакойных, пастэльна-бежавых адценняў нязжатае поле кукурузы — кажуць, пакінулі на зерне. Неверагодна рахманыя белыя козы (іх клічуць, між іншым, Снега і Бусея). Круглыя залацістыя цюкі саломы ў полі.

На цюках варта спыніцца падрабязней. Лавіце лайфхак (падказку, як штосьці зрабіць прасцей і карысней). Такі цюк — цудоўны антыдэпрэсант. Залазіш на яго, кладзешся на спіну, раскідваеш рукі і глядзіш у бяздоннае сіняе неба, пранізанае белымі аблокамі. Думаеш, што ўсё часова ў гэтым свеце, і вечна, і так прыгожа. Ці, наадварот, пераварочваешся на жывот і звешваеш уніз рукі, ногі, галаву — і так ляжыш, боўтаеш імі ў паветры. Ідэальная поза для тых, хто вельмі марыў расслабіцца. Дарэчы, салома — натуральны матэрыял, таму яна, як высветлілася, сапраўды забірае стрэс, дадае станоўчай энергетыкі (да таго ж выдатна захоўвае цяпло, увабранае ад сціплых восеньскіх сонечных промняў). Пасля такой дзесяціхвіліннай рэлаксацыі адчуваеш сябе новенькім!



Асеннія свойскія яблыкі, грушы не параўнаць з крамнымі вінаградам і бананамі, гэта я вам дакладна кажу! А толькі што заквашаная капустачка! А грыбы, сабраныя ўласнымі рукамі ў казачным лесе (такой парою лес бывае толькі «казачным», не інакш). А вараная бульбачка свежага ўраджаю з салёнымі агуркамі з бочкі!

Прырода пускае нас да сябе, дазваляе паглыбіцца ў таемнае, прасякнуцца відавочным. І для кожнага ў яе свая мова, свае непаўторныя і непараўнальныя краявіды. А што пачулі ці ўбачылі вы?..

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже земельного участка в собственность в г. Гродно (микрорайон «Заболоть») 13 ноября 2018 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Стоимость затрат на изготовление документации, (с учетом деноминации), руб. | Начальная цена продажи, (с учетом деноминации), руб. | Сумма задатка (с учетом деноминации), руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-854* | микрорайон «Заболоть» | 0,0994 | 440100000002007263 | - | 14 760,7 | 2 800 |

*Инженерные коммуникации на участке отсутствуют.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 13 ноября 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 с 8 октября по 8 ноября 2018 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 37, 74 20 95, 72 05 46. Официальный сайт организатора торгов – www.grodno.gov.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 20 ноября 2018 г. торгов в форме открытого аукциона по продаже единым предметом не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома и земельного участка в частную собственность

| | |
|---|---|
| Организатор торгов (аукциона) | Столовичский сельский исполнительный комитет |
| Продавец | Столовичский сельский исполнительный комитет, Брестская обл., Барановичский р-н., аг. Столовичи, ул. Поленичицкая, 1 |
| Предмет торгов (аукциона) | Лот № 1: Незавершенное незаконсервированное капитальное строение (не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом).<br>Назначение: 29999 – Здание неустановленного назначения. Наружная площадь – 143 кв. м, фундамент бетонный, процент готовности дома – 3 % |
| | Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 120489003101000067, площадью 0,1195 га, земельный участок предоставляется победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в частную собственность **для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания.**<br>Инженерные коммуникации на участке отсутствуют |
| Местонахождение предмета аукциона | Брестская область, Барановичский район, Столовичский с/с, пос. Октябрьский, ул. Южная, 7 |
| Начальная цена предмета торгов, в т. ч.:<br>начальная цена не завершенного строительством жилого дома;<br>начальная цена земельного участка;<br>расходы на оценку стоимости не завершенного строительством жилого дома | **2603,99 белорусского рубля;**<br>1312,47 белорусского рубля;<br>1099,40 белорусского рубля;<br>192,12 белорусского рубля |
| Сведения о затратах на организацию и проведение аукциона | 61,25 белорусского рубля государственная регистрация; публикация извещения о проведении торгов (аукциона) в СМИ и другие расходы по фактическим затратам |
| Сумма задатка | 260,40 белорусского рубля перечисляется на расчетный счет BY09 AKBB 3604 2112 0000 4130 0000 код банка AKBBBY21802, ф-л 802 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Барановичи, УНП 200018629 до подачи заявления в комиссию.<br>Получатель: Столовичский сельский исполнительный комитет |
| Условия аукциона: | Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:<br>в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за объект аукциона (в счет оплаты засчитывается внесенная сумма задатка) и оплатить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона (в том числе расходы по публикации извещений о проведении аукциона в средствах массовой информации) на расчетный счет, указанный выше, и предоставить в Столовичский сельисполком в течение одного рабочего дня со дня оплаты копии платежных документов;<br>- в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона обратиться в Барановичский филиал республиканского унитарного предприятия «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» (г. Барановичи, ул. Брестская, 186) за осуществлением государственной регистрации права на объект аукциона;<br>- осуществить завершение строительства одноквартирного жилого дома на предоставленном земельном участке в соответствии с действующим законодательством, разработанной и согласованной в установленном порядке проектной документацией в течение 3 лет с даты государственной регистрации земельного участка в Барановичском филиале Республиканского унитарного предприятия «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» |

Торги проводятся в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 87 «О некоторых мерах по сокращению не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач», Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.

К участию в торгах допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица (лично либо через своего представителя), заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток на расчетный счет Столовичского сельского исполнительного комитета (указан выше) и представившие следующие документы:

заявление на участие в аукционе с указанием предмета аукциона;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка;

гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение цены предмета аукциона. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона.

Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона (5 %). В процессе торгов цена предмета аукциона повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемый предмет в соответствии с порядком проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Результаты аукциона в день проведения аукциона оформляются протоколом, который подписывается членами комиссии и победителем аукциона и утверждается председателем комиссии. Победителю аукциона в день проведения аукциона выдается копия протокола о результатах аукциона.

Если победитель аукциона в день проведения аукциона не подписал протокол, результаты аукциона в отношении этого победителя аннулируются, о чем комиссией составляется протокол. При этом внесенный победителем задаток возврату не подлежит, и такой победитель уплачивает штраф, предусмотренный соглашением.

Аукцион состоится 20 ноября 2018 г. в 15.00 по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский р-н, Столовичский с/с, аг. Столовичи, ул. Поленичицкая, 1 (здание сельисполкома). Заключительная регистрация участников аукциона 20 ноября 2018 г. проводится с 14.30 до 15.00.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с даты опубликования настоящего извещения в СМИ и по 14.11.2018 включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, последний день приема документов – 14 ноября 2018 г. до 16.30 по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский р-н, Столовичский с/с, аг. Столовичи, ул. Поленичицкая, 1 (здание сельисполкома, каб. 4).

Заключительная регистрация участников аукциона – 20 ноября 2018 г. с 14.00 до 14.45.

Ознакомление желающих с предметом аукциона будет осуществляться каждый вторник с даты опубликования извещения в СМИ до 14 ноября 2018 г. по предварительной записи.

Телефоны для справок: (80163) 43 53 27, (80163) 43 52 36.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ДВУХ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ
## ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – СТОЛОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ БАРАНОВИЧСКОГО РАЙОНА

| № п/п | Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка | Характеристика инженерных коммуникаций | Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории | Площадь земельного участка, га | Назначение участка | Начальная цена объекта (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Лот № 1 – Брестская обл., Барановичский р-н, Столовичский с/с, дер. Судари, ул. Центральная, 19, 120489004601000024 | Участок свободен от застройки, имеется линия электропередачи, водопровода нет, газопровода нет.<br>Дорога гравийная | В ближайшее время строительство инженерных сетей не предусмотрено | 0,1997 га | **Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания** | 1397,90 | **139,79** | 576,52 рубля, кроме того, расходы по размещению извещения в СМИ (по фактическим затратам) |
| 2 | Лот № 2 – земельный участок Брестская обл., Барановичский р-н, Столовичский с/с, аг. Столовичи, ул. Новая, 6В, 120489004101000492 | Участок свободен от застройки, имеется линия электропередачи, имеется возможность подключения к централизованному водопроводу, газопроводу.<br>Дорога гравийная.<br>Земельный участок имеет ограничения: на площади 0,0054 га в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт, на площади 0,0320 га в охранной зоне линии связи | В ближайшее время строительство инженерных сетей не предусмотрено | 0,1644 га | **Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания** | 2544,91 | **254,49** | 1588,87 рубля, кроме того, расходы по размещению извещения в СМИ (по фактическим затратам) |

Условия продажи: участки продаются без изменения их целевого назначения.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 5 %.

Организатор и продавец аукциона: Столовичский сельский исполнительный комитет, Барановичского района, Брестской области, аг. Столовичи, ул. Поленичицкая, 1.

**Условия аукциона:** участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики. Победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона, обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за земельный участок (без права предоставления рассрочки) и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обратиться за государственной регистрацией прав на земельный участок в Барановичский филиал республиканского унитарного предприятия «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» (г. Барановичи, ул. Брестская, 186); получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; **приступить к занятию земельного участка в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права частной собственности на него, в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство одноквартирного жилого дома) и использовать земельный участок по целевому назначению, в противном случае земельный участок будет изъят;** возместить затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной инфраструктуры к земельному участку (водоснабжение, электроснабжение, газоснабжение, транспортная инфраструктура) путем единовременного перечисления средств в доход бюджета в течение срока строительства дома, установленного в проектной документации с учетом индексации.

Аукцион состоится **20 ноября 2018 года в 16.00** в здании Столовичского сельского исполнительного комитета по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский р-н, Столовичский с/с, аг. Столовичи, ул. Поленичицкая, 1.

Для участия в аукционе необходимо внести задаток, указанный в графе 8 таблицы (10 % от начальной цены земельного участка), задаток перечисляется в белорусских рублях с даты опубликования настоящего извещения по 14 ноября 2018 г. включительно до 16.00 на расчетный счет BY09 AKBB 3604 2112 0000 4130 0000 код банка AKBBBY21802, ф-л 802 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Барановичи, УНП 200018629. Получатель: Столовичский сельский исполнительный комитет (с пометкой «задаток за земельный участок»).

Граждане, желающие принять участие в аукционе, представляют в комиссию по аукциону следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином — копия документа, удостоверяющего личность (паспорт), без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина — копия документа, удостоверяющего личность (паспорт), и нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют документ, удостоверяющий личность (паспорт), а представители граждан — документ, удостоверяющий личность (паспорт), и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляется** с даты опубликования настоящего извещения в СМИ и по14.11.2018 включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. Последний день приема документов – 14 ноября 2018 г. до 16.30 по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский р-н, Столовичский с/с, аг. Столовичи, ул. Поленичицкая, 1 (здание сельисполкома, каб. № 4). Заключительная регистрация участников аукциона – 20 ноября 2018 г. с 15.30 до 15.45. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

Ознакомление желающих с предметами аукциона будет осуществляться каждый вторник недели по предварительной записи. Телефоны для справок: (80163) 43 53 27; (80163) 43 52 36.

Уладзімір ШАНТАРОВІЧ:

# «КАЖУЦЬ, Я — ГЕНІЙ, І МНЕ ГЭТА ВЕЛЬМІ НЕ ПАДАБАЕЦЦА»

## Як трэнер пабудаваў сістэму, якая выхоўвае алімпійскіх чэмпіёнаў



**Уладзімір Шантаровіч прыйшоў у веславанне, калі вучыўся ў сёмым класе, да гэтага ў полі яго інтарэсаў таксама быў спорт — футбол і баскетбол. З юных гадоў ён прывык да працы: спачатку падпрацоўваў на заводзе ў бацькі, а потым трапіў у сферу, якая стала яго стыхіяй, сэнсам жыцця і лёсам. Перад уласнай спартыўнай кар'ерай ён аддаў перавагу трэнерскай справе, стаўшы настаўнікам у зборнай СССР не дасягнуўшы нават трыццаці. Сёння Уладзімір Уладзіміравіч ужо практычна два дзясяткі гадоў стаіць каля руля зборнай Беларусі. Яго вучні штогод прывозяць россып медалёў рознай вартасці, у тым ліку алімпійскія, а галоўнае, ён пабудаваў сістэму падрыхтоўкі весляроў, якая працуе ўжо больш за 20 гадоў. Пра тое, як усё пачыналася ў далёкія 70-я, пра адносіны настаўніка і вучняў, пра свае перамогі і паражэнні Уладзімір Уладзіміравіч расказаў у інтэрв'ю «Звяздзе».**

### «Рэдка бывае, што вялікія спартсмены становяцца выдатнымі трэнерамі»

**— На першай трэніроўцы па веславанні вы селі ў лодку з будучым алімпійскім чэмпіёнам Мікалаем Гарбачовым. Верыце ў знакі, можа, гэта не проста так?**

— Вядома, веру! Мікалай Сцяпанавіч — вялікі спартсмен, таленавіты чалавек, на той момант ужо быў чэмпіёнам СССР, але, калі прыязджаў у родны Рагачоў, падпрацоўваў. Сядаў у лодку і абкатваў маладых. Так зараз робіць і нашы некаторыя спартсмены. Ён пракаціў мяне і сказаў: «Давай, малы, ідзі, трэніруйся, у цябе ўсё атрымаецца!» Пасля Гарбачоў стаў алімпійскім чэмпіёнам, а я пачаў калупацца, хадзіць на гэтую працу. Для школьніка гэта ўжо праца, пакуль гульня, але ўсё роўна праца.

**— Хто для вас тады быў аўтарытэтам?**

— Нашы першыя алімпійскія чэмпіёны Леанід Гейштар і Сяргей Макаранка, яны тады былі вельмі папулярныя, асабліва ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях. У Саюзе была вельмі моцная канкурэнцыя, веславанне было вельмі распаўсюджаным відам спорту, але будавалася толькі на энтузіязме. Калі спартсмен трапляў у маладзёжную або дарослую зборную, то ведаў, што са спаборніцтваў дакладна прыедзе з медалямі, таму ўсе імкнуліся туды трапіць. Можна параўнаць той час з сённяшнім: мы прыязджаем з маладзёжнага чэмпіянату свету — 14—15 медалёў, студэнцкі чэмпіянат свету ў беларусаў — 23 узнагароды, дарослыя чэмпіянаты свету, Еўропы — 8-9 медалёў. Усяго, дарэчы, у нас сёлета 45 узнагарод. Сёння Беларусь — адна з найлепшых краін па падрыхтоўцы рэзерву, у якой прысутнічае тэхналогія адбору і методыка падрыхтоўкі.

**— Вы вельмі рана сталі трэнерам, гэта сведчыць аб тым, што амбіцый настаўніка было больш, чым спартсмена?**

— У 1973 годзе я скончыў універсітэт і па размеркаванні паехаў на працу ў Мазыр. А калі трэніраваўся, бачыў усе недапрацоўкі спецыялістаў, у якіх я вучыўся, у педагогіцы, у пабудове руху. У Мазыр з сабой запрасіў сябра Віталя Віктаравіча Скрыганава. Там мы стварылі з ім моцную дзіцяча-спартыўную школу з унутранай канкурэнцыяй, яна нарадзіла вынік. Пачалі на першыя ўсесаюзныя спаборніцтвы і там яго паказалі. А з часам атрымалася выбудаваць сістэму, якую спрабуе стварыць уся краіна і ўвесь свет. Пасля дзіцячай спартыўнай школы нашы весляры пераходзяць у вучылішча алімпійскага рэзерву, далей — у ВНУ, калі працягваюць паказваць вынікі, аказваюцца ў школе найвышэйшага спартыўнага майстэрства, а потым — нацыянальныя і зборныя каманды. Гэтая сістэма і нарадзіла восем алімпійскіх медалёў, чэмпіёнаў свету, іх у Мазыры толькі дзесяць, а ёсць і сяміразовыя, і пяціразовыя. Хоць у раёне 120 тысяч насельніцтва, уяўляеце, якая статыстыка? І гэта мы толькі аб дарослых спаборніцтвах гаворым.

### У кнігах не пішуць, як рыхтаваць чэмпіёнаў...

**— Колькі вам спатрэбілася часу, каб самому выбудаваць гэтую сістэму?**

— Галоўны трэнер сёння — зборны вобраз, я выслухаю навуку, спецыялістаў у многіх галінах, а потым толькі пачынаю нешта рабіць, гэта руцінная праца. Не прыходзяць ідэі ў галаву проста так, спантанна. Кажуць, вялікі палкаводзец Шантаровіч, геній. Мне гэта вельмі не падабаецца. Што такое геній? Я ж нічым не адрозніваюся, напрыклад, ад старшага трэнера, нават калі браць заробак. Самае важнае для галоўнага трэнера — праз прызму бачыць усю краіну, дзе ёсць базы, дзе ёсць цэнтры, што рабіць з канкрэтнай узроставай групай, як змяняць тэхнічнае абсталяванне. Сёння ў нас аснова асноў — антрапаметрыя, функцыянальная дыягностыка, а далей залежыць ад таго, як ты правільна пабудуеш спартсмену крок у веславанні. Гэта тэхнічнае выкананне, якасць веславання, гэта прыкладанне намаганняў, перадача іх вадзе, каб лодачка рэагавала, біямеханіка. Калі гэтыя навыкі не закласці з пачатковай стадыі падрыхтоўкі, не ўдзяліць сур'ёзна гэтаму ўвагі, няма сэнсу спрабаваць чагосьці дасягаць у вялікім спорце.

Колькі часу мне спатрэбілася, каб выбудаваць гэтую сістэму? Не магу адказаць дакладна. Сёння ўвесь свет вяслуе, у нас сем тысяч займаюцца веславаннем, але становяцца чэмпіёнамі нямногія. Спыняцца нельга, кожны год трэба ўводзіць нешта новае, вось я ўжо сёння сяджу і думаю, што трэба рыхтавацца да Токіа-2020, таму што прадстаўленне матэрыялу ўжо павінна быць іншае, не як чатыры гады таму. Калі ты не прыехаў на нейкую канферэнцыю, ты ўжо адстаў, нічога не ўкраў сваімі думкамі. Калі варышся ў сваёй руціне, паўтараеш уласныя памылкі.

Сёння я сам сябе прымушаю працаваць, хоць усе свае амбіцыі ўжо задаволіў, алімпійскія чэмпіёны ёсць, чэмпіёны свету таксама. Быў час, калі атрымліваў зарплату 15—17 долараў, але ўсё роўна застаўся на гэтай працы, таму што хачу вынікаў. Не тое, каб я нічога больш не мог рабіць, магу, але душа не ляжыць.

> **«Сёння ўвесь свет вяслуе, у нас сем тысяч займаюцца веславаннем, але чэмпіёнамі становяцца нямногія...»**

**— Пра што вы марылі, калі толькі пачыналі рабіць першыя крокі ў трэнерскай справе?**

— Усе мары прыходзілі паэтапна, перамагчы адзін узровень, маладзёжны, потым другі. А цяпер ужо, вядома, галоўная мэта — Алімпійскія гульні. Хацеў бы прыехаць з Алімпіяды з працэнтамі сарака медалёў, якія там разыгрываюцца. Сёння гэта складана з той колькасцю людзей, якія займаюцца, з якасцю здароўя, характарам, таму патрэбна прадуманая якасная праца. Некалькі няправільных трэніровак выбіваюць спартсмена на месяц. Сёння мы вялікую ўвагу ўдзяляем селекцыйнай працы на вёсцы, таму што там яшчэ ёсць здаровыя, дужыя людзі, гэта ім генетыкай закладзена. Мы, дарэчы, вельмі шмат займаемся гэтай навукай.

### «Ехаў, абяцаў, перамог»

**— Хто стаў вашым першым алімпійскім чэмпіёнам?**

— Чацвёрка ў складзе Петрушэнкі, Абалмасава, Літвінчука і Махнева.

**— Памятаеце тыя эмоцыі?**

— Так. Гэтая эмоцыя доўжыцца літаральна пару хвілін, пачуццё выкананага доўгу і працы. Ехаў, абяцаў, перамог і да вечара забыўся. Трэба забываць, таму што інакш не будзе прагрэсу.

**— Псіхалогія ва ўсіх алімпійскіх чэмпіёнаў адна?**

— Яны ўсе валодаюць псіхалагічнай устойлівасцю, моцным характарам, агрэсіяй, але кожны ў рознай ступені. Камусьці гэтых якасцяў хапае на адзін старт, а ў другога ў кар'еры па дзве, тры алімпіяды. Часам у спартсмена ёсць усе даныя, але правал у псіхалогіі, ён выходзіць на старт і становіцца ватны, увесь адрэналін ужо выйшаў ноччу, ён ужо наспаборнічаў. Чэмпіён — гэта штучны матэрыял. Ракету запусціць складана, трэба шмат спецыялістаў, а мы працуем з жывым матэрыялам, які на парадак больш непрадказальны, асабліва гэта разумеюць тыя, хто працуе з дзяўчатамі.

**— Чэмпіёны, як і многія таленавітыя людзі, часта бываюць з няпростым характарам, складана з імі працаваць?**

— Я не звяртаю на іх характар асаблівай увагі. У прафесіяналаў павінна быць адно разуменне: ты атрымліваеш заробак, а значыць, павінен прыходзіць і выконваць заданне. Калі ты яго не робіш, значыць, гэта сабатаж. Калі ў цябе характар і ў мяне характар, значыць, трэба памяняць трэнера. Былі выпадкі, што сыходзілі. Панібрацтва пачынаецца, калі выкладчык не можа выразна растлумачыць заданне спартсмену. Я прымаю дыялог, вучні могуць спрачацца, але толькі калі гэта не «гнілая» філасофія. Ведаеце, калі б я бійся з усімі, каго лічу няправым... Трэба берагчы сваю энергію, таму я стараюся не канфліктаваць. Робіш — рабі, не — сыходзь. Хочаш нешта даказаць, дакажы, у нас жа няма прыгоннага права, заўсёды можна пераехаць у іншую краіну.

**— Любімчыкі былі?**

— Такога паняцця быць не павінна.

### «У поўную сілу я і зараз яшчэ да працы не прыступіў»

**— Як успамінаеце перадалімпійскі час 2016-га?**

— Не хачу яго згадваць. Гэта трагедыя, мы страцілі два-тры медалі на роўным месцы.

**— У гэты складаны для вас час хто быў побач?**

— Знаёмыя стараліся не нагадваць мне пра гэта. Былі людзі, якія выказваліся ў СМІ, маўляў, трэба разбірацца, не да канца верылі ў нашу чысціню. Гэта казалі ў тым ліку і некаторыя вялікія спартсмены, «рэвізоры» якія, для іх увесь час усё будзе дрэнна.

**— Якія словы тады вы знаходзілі для спартсменаў, што былі адхіленыя ад Алімпійскіх гульняў?**

— Яны не мелі патрэбы ў словах, ім хацелася падтрымкі на больш высокім узроўні. Міжнародная федэрацыя або САДА (Сусветнае антыдопінгавае агенцтва. — **Заўв. рэд.**), калі ладзяць скандал, чакаюць рэакцыі кіраўніцтва краіны або Міністэрства спорту. У нас было маўчанне, а яны разлічвалі на тое, што галовы пачнуць секчы без разбору.

Людзі не разумелі, як мы маглі за тры-чатыры алімпійскія цыклы так падняць беларускае веславанне. Тая аблава на нашу каманду ў Францыі не была першай, яны праводзілі заканамерныя праверкі і раней, потым зачасцілі, потым зусім сціхлі. Але на чэмпіянаце Еўропы ў Мілане мы заваявалі пяць залатых медалёў і вялікія краіны не разумелі, што яны з такім раскладам будуць рабіць на Алімпіядзе.

**— Пасля гэтай трагедыі вы не склалі рукі, як хутка вярнуліся да працы?**

— Пасля пэўнага адпачынку, але ў поўную сілу я і зараз яшчэ да працы не прыступіў. Не толькі мяне гэтая сітуацыя падкасіла на пару гадоў. Напрыклад, Арцём Козыр на той Алімпіядзе мог мець медалі, а цяпер яго дысцыпліны зусім няма ў алімпійскай праграме. Ён тры разы выйграваў чэмпіянат свету ў ёй, разумееце? А алімпійскім чэмпіёнам так і не стаў.

### «Часам здавалася, што цябе не разумее ўвесь свет»

**— Ваша жонка таксама са спорту, сын сёння трэніруе зборную Казахстана па веславанні...**

— Калі б я са спявачкай сустрэўся ці яшчэ з кімсьці, думаю, жыцця б не было. Бо я 10—11 месяцаў з заплечнікам за спінай па аэрапортах. Жонка прыняла мой лад жыцця толькі таму, што сама са спорту. Сур'ёзных грошай ніколі не было, яны з'явіліся толькі цяпер. Яна разумела, што мне трэба было ўгнацца за гэтай індустрыяй, заўсёды вельмі моцна мне дапамагала. Часам здавалася, што цябе не разумее ўвесь свет, а дома я заўсёды адчуваў падтрымку. У шлюбе мы ўжо 39 гадоў.

Сын з пяці гадоў ездзіў са мной на зборы, таму вельмі шмат убраў у сябе, выйсці з гэтай секты, а спорт найвышэйшых дасягненняў — гэта секта, было яму складана. У сілу абставін з вялікага спартсмена заўважыць у ім не мог, таму што на гэта проста не хапала часу. Зараз мы заўсёды на сувязі, стэлефаноўваемся кожны дзень у сем вечара, у якім бы месцы свету не знаходзіліся.

**— Ці не баіцеся, што калі-небудзь ён вас перарасце?**

— Дай Божа! Калі вучань перарастае свайго настаўніка, то надыходзіць прагрэс.

**— Уладзімір Уладзіміравіч, у чым вы чэрпаеце сілы?**

— Нічога акрамя спорту. З хобі ў жыцці неяк не склалася: ні з грыбамі, ні з рыбалкай. Магу выйсці ў цырк, тэатр, музей, але гэтыя, здавалася б, прыгажосці мяне ўжо не ўражваюць. Мне трэба час у жыцці некалі гэта зразумець і перабудавацца. Трэба ўжо вучыцца, бо яшчэ тры гады і семдзесят.




Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

# У РЫТМАХ САМБЫ



## Куды рушыць Бразілія?

**У Бразіліі біржавыя каціроўкі адрэагавалі ростам на перамогу ў першым туры прэзідэнцкіх выбараў ультраправага кандыдата ад Сацыял-ліберальнай партыі Жаіра Балсанару. Асноўны індэкс біржы бразільскага Сан-Паўлу Bovespa на адкрыцці таргоў у пачатку мінулага тыдня падскочыў на шэсць працэнтаў. Пасля рост запаволіўся, але прадоўжыўся. Курс нацыянальнай валюты таксама ўмацаваўся. Балсанару атрымаў 46 працэнтаў галасоў (яго падтрымалі 49 мільёнаў выбаршчыкаў). На другім месцы апынуўся кандыдат ад Партыі працаўнікоў (ПП) Фернанда Хадад, за якога прагаласавалі 29 працэнтаў (30 мільёнаў чалавек). Прэзідэнцкія выбары ў Бразіліі праходзяць на фоне эканамічнага крызісу, які суправаджаецца падзеннем ВУП і дэвальвацыяй нацыянальнай валюты. Куды рушыць найбуйнейшая эканоміка Лацінскай Амерыкі?**

### ВЫПРАБАВАННЕ ДЛЯ КАПІТАНА

Жаір Месіяш Балсанару — так гучыць поўнае імя пераможцы першага тура прэзідэнцкіх выбараў у Бразіліі, якога многія прыхільнікі называюць проста «Месія». Яшчэ нядаўна гэты дэпутат бразільскага парламента лічыўся ледзь не маргінальнай фігурай, эпатаваў публіку сваімі выказваннямі пра гендарную няроўнасць, сексуальныя і расавыя меншасці. Але сітуацыя змянілася. У выпадку перамогі Балсанару ў другім туры ён стане першым за шмат гадоў прэзідэнтам Бразіліі, які выйшаў з ваеннага асяроддзя. Капітан паветрана-дэсантных войскаў у адстаўцы пачаў палітычную кар'еру ў 1989 годзе ва ўзросце 34 гадоў, стаўшы муніцыпальным дэпутатам у Рыа-дэ-Жанэйра ад Хрысціянска-дэмакратычнай партыі. Да таго моманту ён быў ужо нядрэнна вядомы шырокай публіцы дзякуючы нашумеламу артыкулу для часопіса Veja, у якім крытыкаваў нізкія заробкі ваенных афіцэраў, за што яму давялося паўмесяца правесці пад арыштам. У 1990 годзе Балсанару быў абраны дэпутатам ніжняй палаты бразільскага Кангрэса і затым дзякуючы асабістай харызме (асабліва варта адзначыць яго знешнія даныя — рост 186 сантыметраў) пераабіраўся тугды яшчэ шэсць разоў запар.

Нягледзячы на неаднаразовыя змены партыйнай прыналежнасці, палітык заўсёды захоўваў рэнамэ жорсткага кансерватара. У розны час ён выступаў супраць аднаполых шлюбаў, абортаў, лібералізацыі заканадаўства пра наркотыкі, земельных рэформаў. Увогуле за больш чым чвэрць стагоддзя парламенцкай кар'еры ён вылучыў больш за 170 законапраектаў і адну канстытуцыйную папраўку. Аднак у значна большай ступені ён запомніўся бразільцам сваімі заявамі за межамі паліткарэктнасці.

Як заўважаюць эксперты, выбаршчыкаў вабяць не эпатажныя выказванні Балсанару, а лозунгі аб барацьбе з хабарніцтвам і карупцыяй, якія ператварыліся ў праблему нацыянальнага маштабу. На думку аўтарытэтных экспертаў, за апошнія гады карупцыя сапраўды ператварылася ў нацыянальнае бедства. Яе характэрная асаблівасць у Бразіліі заключаецца ў тым, што ў ёй замяшаны практычна ўсе прэтэндэнты на выбарчыя пасады. «Калі эканоміка ў заняпадзе і ўсе слаі грамадства адчуваюць сябе ўсё горш, гарачыя прамовы Балсанару кранаюць за жывое», — піша пра палітыка The Washington Post.

Балсанару выступае за рэзкае скарачэнне бюракратычнага апарату, за нашэнне зброі для барацьбы з крыміналам, за прыватызацыю большасці дзяржаўных прадпрыемстваў. Палітыка называюць стаўленікам багатых бразільцаў, але было б памылкова меркаваць, што яго гатовыя падтрымаць толькі багатыры. Сярод прыхільнікаў Балсанару нямала прадстаўнікоў іншых слаёў, незадаволеных становішчам краіны, якая перажывае зусім не самыя лепшыя часы пасля перыяду ўздыму, калі ўсе захапляліся яе эканамічнымі поспехамі.

Падчас перадвыбарчай кампаніі на Балсанару, які выступаў на мітынгу ў штаце Мінас-Жэраіс, быў здзейснены напад. Ён перанёс сур'ёзную аперацыю і доўгі час працягваў кіраваць кампаніяй, знаходзячыся ў клініцы. Шэраг аналітыкаў сцвярджалі, што дадзеная акалічнасць выклікала хвалю спагады ў некаторых катэгорый электарату і ўмацуе пазіцыі кандыдата.




### ФАКТАР ЛУЛЫ

Поспех Балсанару ў першым туры прэзідэнцкіх выбараў стаў у першую чаргу сведчаннем глыбокага расладу ў шэрагах бразільскіх левых, а дакладней левых лібералаў, якія так і не змаглі справіцца з эканамічным крызісам у краіне. Хоць у пачатку дзевяностых менавіта крызіс у эканоміцы і прывёў іх да ўлады. Фернанду Энрыке Кардозу, абраны прэзідэнтам у 1994 годзе, здолеў хутка справіцца з гіперінфляцыяй, стварыў умовы для прыцягнення ў краіну замежных інвестыцый, росту экспарту і азначыў шэраг сур'ёзных сацыяльных праграм, якія былі рэалізаваны пры яго пераемніку Луісе Інасіу Лулу да Сілву, які прадстаўляў Партыю працоўных. Восем гадоў кіравання Лулы (2003—2010) былі адзначаны значным зніжэннем беднасці і высокімі тэмпамі эканамічнага росту, але адначасова ўсё больш вострай праблемай для Бразіліі станавілася карупцыя.

Склаўшы паўнамоцтвы з-за хваробы, Лула блаславіў на прэзідэнцтва Дзілму Русеф, дачку балгарскага камуніста, які пакінуў радзіму яшчэ паміж дзвюма сусветнымі войнамі і ў выніку пасяліўся ў Бразіліі. Пасля імпічменту Русеф прэзідэнцкія паўнамоцтвы перайшлі да віцэ-прэзідэнта Мішэля Тэмера, але і ён вельмі хутка апынуўся ў цэнтры карупцыйных скандалаў. Вылучаць сваю кандыдатуру на гэтыя выбары ён адмовіўся, падтрымаўшы былога міністра фінансаў Бразіліі Энрыке Мейрэлеса (які, зрэшты, таксама не меў ніякіх сур'ёзных шанцаў). Планы не вяртанне ў палітыку меў Лула да Сілва, але яго кандыдатура не была зарэгістраваная, і асноўным кандыдатам ад левых стаў прадстаўнік Партыі працоўных, колішні мэр Сан-Паўлу Фернанду Адад. Ён сур'ёзна заклапочаны становішчам беднякоў, насельнікаў бразільскіх фавел, так добра знаёмых многім па рамане бразільскага класіка Жоржы Амаду «Капітаны пяску».

Адад выхадзец з сям'і ліванскіх эмігрантаў, які мае практычна бездакорную рэпутацыю, ён не заплямлены карупцыйнымі скандаламі. Але яго падтрымала Партыя працоўных, якая шмат у каго з гэтымі скандаламі якраз і асацыюецца. Таму частку галасоў Балсанару атрымаў ад тых, хто проста не хацеў, каб новы прэзідэнт Бразіліі прадстаўляў гэтую партыю. Акрамя таго, галасы ў Адада адбіралі іншыя ўдзельнікі першага тура, да якога было дапушчана больш за дзесяць кандыдатаў. Таму, нягледзячы на значны разрыў паміж Балсанару і Ададам, перад другім турам захоўваецца сур'ёзная інтрыга.

### СЛЕД ВАШЫНГТОНА

Эканоміка Бразіліі ацэньвалася Міжнародным валютным фондам у 2,05 трыльёна долараў у 2017 годзе. Гэта восьмы пакажчык у свеце. Для параўнання эканоміка Італіі з'яўляецца дзявятай ($1938 млрд), Расіі — 12-й ($1527 млрд), Турцыі — 17-й ($857 млрд), а Аргенціны — 21-й ($545 млрд). Таму праблемы Бразіліі сапраўды шакіруюць сусветны рынак і спраўкуюць далейшы негатыўны ўплыў на эканомікі, якія развіваюцца.

Палітычныя катаклізмы апошніх трох гадоў сталі суправаджэннем эканамічнага крызісу, які адкрыта праявіў сябе ў 2015 годзе, калі аб'ём валавога ўнутранага прадукту краіны зваліўся на 3,8 працэнта. Па выніках 2016-га ВУП краіны зваліўся яшчэ на 3,6 працэнта, а назапашаны за пару гадоў спад аказаўся самым глыбокім пачынаючы з 1947 года. Фінансавыя інструменты, якім аддавалі перавагу папярэднія кіраўнікі дзяржавы Лула і Русеф, відавочна не працавалі: замест росту эканомікі за кошт дзяржаўных стымулаў Бразілія атрымала дэфіцыт бюджэту ў 9 працэнтаў ВУП. Закрываць гэтую дзірку ўрад вырашыў тыпова неаліберальным спосабам: абвясціў аб планах маштабнай прыватызацыі.

У мінулым годзе эканоміка Бразіліі перастала падаць — рост ВУП склаў адзін працэнт. Сёлета прагназавалася паскарэнне да прыкладна 2,8 працэнта, але эканоміцы краіны не ўдалося пазбегнуць дэвальвацыйнай хвалі. Бразільскі крызіс мае дваякую прыроду, адзначыў vz.ru кіраўнік цэнтра эканамічных даследаванняў Інстытута глабалізацыі і сацыяльных рухаў Васіль Калташоў. З аднаго боку, гэта крызіс неаліберальнай інтэграцыі ў сусветны рынак: «Бразілія, якая ўбудоўваецца ў міжнародныя адносіны, экспартавала свае тавары, змагалася за замежныя інвестыцыі і ў той жа час спрабавала быць сацыяльнай дзяржавай, прыбыткі краіны забяспечвалі сродкі для сацыяльнай палітыкі. Партыя працы дзейнічала па прынцыпе: расце эканоміка — пашыраем сацыяльную палітыку. Але рост эканомікі Бразіліі абарваўся яшчэ ў 2013 годзе».

З іншага боку, адзначыў Васіль Калташоў, крызіс у Бразіліі прадэманстраваў крайнюю недастатковасць ранейшай стратэгіі і ў адносінах з іншымі краінамі Лацінскай Амерыкі. «Бразілія не спрабавала ініцыяваць інтэграцыйныя праекты ў Лацінскай Амерыцы, хоць гэта адзіная краіна кантынента, здольная запусціць такія працэсы», — заўважыў эканаміст. Такая сітуацыя, мяркуе Калташоў, перш за ўсё гуляе на руку ЗША, для якіх у Паўднёвай Амерыцы не можа быць ніякай больш важнай задачы, чым абясшкодзіць Бразілію. Тут можна ўспомніць аб магчымым следзе Вашынгтона ў гісторыі з імпічментам Дзілмы Русеф, за якой, хутчэй за ўсё, вялося сур'ёзнае назіранне ЦРУ.

Паводле інфармацыі мексіканскай газеты Universal, на падмогу Балсанару нават «выпісаны» з Вашынгтона былы паліттэхнолаг Трампа Стывен Бэнан, які цяпер кансультуе бразільскага ўльтраправага палітыка. «Бэнан гатовы аказаць дапамогу. Ён будзе часова выконваць абавязкі дарадцы, але пры гэтым яго дзейнасць не будзе аплачвацца», — паведаміў у інтэрв'ю газеце Globo сын Балсанару Эдуарду — член палаты дэпутатаў бразільскага парламента. Па словах Балсанару-малодшага, Бэнан дапаможа наладзіць эфектыўную аналітычную дзейнасць і выбудаваць паспяховую перадвыбарчую кампанію ў сацсетках. Асноўным козырам Балсанару будзе пазіцыянаванне ў якасці палітыка нацыянальнага маштабу, прыхільніка «цвёрдай рукі», не замяшанага ні ў якіх карупцыйных скандалах.



### РАСКЛАД НА ЗАЎТРА

Як заўважыў iz.ru эксперт Расійскага інстытута стратэгічных даследаванняў Ігар Пшанічнікаў, найбліжэйшыя дні стануць часам вострага расколу краіны на прыхільнікаў левых і правых сіл. Кожнаму з удзельнікаў другога тура выбараў трэба будзе перацягнуць на свой бок тых выбаршчыкаў, якія адхілілі іх кандыдатуры падчас першага тура, аддаўшы свае галасы за іншых 11 прэтэндэнтаў. І цяжэй за ўсё прыйдзецца, як ні дзіўна, менавіта Балсанару, паколькі супраць яго, паводле апытанняў, выказваецца 44 працэнты выбаршчыкаў. Гэта значыць, можна выказаць здагадку, што ўсе, хто хацеў прагаласаваць за «бразільскага Трампа», гэта ўжо зрабілі. І ў Балсанару, так можа скласціся, ужо няма дадатковага рэсурсу сярод выбаршчыкаў.

А вось Фернанду Адад цалкам можа мабілізаваць увесь левы фланг бразільскай палітыкі, выкарыстоўваючы вельмі скаардынаваны і дысцыплінаваны апарат сваёй Партыі працоўных. Эксперты мяркуюць, што, калі палітычныя лідары «цэнтра» афіцыйна прамаўчаць і не выступяць у падтрымку ні таго, ні іншага кандыдата ў другім туры, гэта фактычна стане сведчаннем іх падтрымкі «бразільскага Трампу». Разам з тым трэці па колькасці набраных галасоў (12 працэнтаў) у першым туры Сіру Гоміш, які прадстаўляе Дэмакратычную рабочую партыю, ужо заявіў, што заклікае сваіх прыхільнікаў галасаваць за Адада.

Што датычыцца знешняй палітыкі Бразіліі, то, цалкам відавочна, у выпадку, калі прэзідэнтам стане Балсанару, краіна пойдзе ў фарватары знешнепалітычнага курсу ЗША, адзначыў Ігар Пшанічнікаў. Калі кіраўніком дзяржавы стане Адад, дзяржава будзе актыўна развіваць супрацоўніцтва ў рамках БРІКС, а амерыканцы страцяць свае пазіцыі ў гэтай краіне. Акрамя таго, пры Ададзе можна чакаць умацавання адносін Бразіліі з такімі гульцамі рэгіёна, як Куба, Венесуэла, Нікарагуа і Балівія, якія адкрыта стаяць на антыамерыканскіх пазіцыях. Зрэшты, дакладны расклад вызначыцца ўжо хутка.

**Захар БУРАК.**

Руплівым гаспадарам

# МАЛАДЗІЛЬНЫЯ ЯГАДЫ

## Якія новыя культуры варта пасяліць у садзе?

**Наспеў час, калі яблыням і парэчкам давядзецца пацясніцца: сёння дзякуючы актыўнай рабоце селекцыянераў на рынку з'явілася багата экзатычных навінак, прычым нязвыклыя раней для нас ягады выдатна прыстасаваныя да беларускага клімату. Многія з іх непераборлівыя — не патрабуюць асаблівага догляду, не хварэюць (айчынныя шкоднікі не праяўляюць цікавасці да такіх навінак). Экзоты ўпрыгожаць любы ўчастак: вясной парадуюць дружным цвіценнем, летам укрыюць альтанкі, а ўвосень аддзячаць гаспадарам карыснымі пладамі.**

У садах Інстытута пладаводства НАН Беларусі сёння прадстаўлены 29 ягадных культур, сярод іх травяністыя (накшталт суніц садовых), ліяны (актынідыі і ажыны-расянікі), кусты (гумі, парэчкі, агрэст) і дрэвы (чаромха, ірга).

### КАРЫСНАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ

Адным з прэтэндэнтаў на сонечнае месца ў вашым садзе, бясспрэчна, будзе кізіл. Нягледзячы на тое, што расліна прыйшла да нас з Украіны, яна можа выдатна вырошчвацца па ўсёй Беларусі. Так, у садах Інстытута пладаводства вучоныя ніколі не мелі з гэтай культурай праблем: яна цудоўна зімуе і пачынае квітнець, як толькі сыходзіць снег. Менавіта за сакавіцкае цвіценне кізіл палюбілі ландшафтныя дызайнеры, але варта на яго звярнуць увагу і пчалярам. Адзін з самых першых меданосаў, кізіл вельмі радуе пчолак, якія толькі пачынаюць аблятацца. Яшчэ плюс у тым, што плады выспяваюць у канцы жніўня, верасні. Як правіла, да гэтага часу традыцыйныя ягадныя культуры ўжо адышлі, а тут — такі шыкоўны падарунак, прычым з яго можна рабіць усе тыя ж нарыхтоўкі, як і з вішні. Да таго ж кізіл можа доўга захоўвацца. Калі ягады сабраць крыху недаспелымі, яны могуць каля тыдня «пачакаць», пакуль гаспадыня не прыдумае, як упарадкаваць ураджай.

Увосень радуе вітаміннымі падарункамі актынідыя. Хто адпачываў у Іспаніі, напэўна заўважыў, што ў супермаркетах прадаюцца так званыя міні-ківі. Яны выдатна растуць і ў Беларусі. У нас раянаваныя ўкраінскія жаночыя сарты Кіеўская буйнаплодная і Цудоўная. Для іх вучоныя падабралі мужчынскія формы-апыляльнікі Камандор і Прывабны. Каб атрымаць ураджай, актынідыі, як і абляпіссе, патрабуецца пара. Але сёння на рынку можна знайсці і сарты, якія могуць абыходзіцца без апыляльніка. Праўда, як заўважылі вучоныя, нават самаплодныя ліяны даюць большы ўраджай, калі побач расце мужчынская форма.

Каб разабрацца, якая з актынідый лепшая — аргута ці каламікта, — звяртаюся па кансультацыю да **загадчыка лабараторыі генетычных рэсурсаў ягадных культур Інстытута пладаводства Людмілы ФРАЛОВАЙ.**

— Я параіла б вырошчваць каламікту. Яе можна выкарыстоўваць у якасці жывой агароджы, яна непатрабавальная, вельмі дэкаратыўная, калі пачынае квітнець, лісты становяцца бела-малінавымі. У свеце ж больш распаўсюджаная аргута. Расліны розняцца формай ліста, памерам. У садзе інстытута пад аргуту нават жалезную шпалеру паставілі, бо драўляная пад гэтай магутнай трапічнай ліянай ламаецца. Ягады на ёй буйнейшыя і выспяваюць пазней, чым у каламікты.

Такія расліны змяшчаюць актынідын (рэчыва, якое дапамагае перапрацоўваць бялок у арганізме чалавека) і будуць карысныя для ляжачых, хворых з парушэннем абмену рэчываў, цяжарных жанчын. Але трэба ведаць меру — ужываць не больш за сем пладоў за раз, каб не было слабіцельнага эфекту. Актынідыю можна марозіць, рабіць фруктовы лёд, дадаваць у смузі.

Яшчэ ёсць такі від актынідыі, як палігама, — з горкімі пладамі, падобнымі на маленькія перчыкі. Апыляльнік для гэтага сорту знайсці складана, і таму часта расліна бясплодная і выкарыстоўваецца ў дэкаратыўных мэтах.


Актынідыя.


Хенамелес.


Кізіл.


Шаўкоўніца.

У азеляненні знайшлося прымяненне і іншым ягадным культурам — барбарысу (з яго пладоў можна зрабіць добрую прыправу), каліне (пойдзе на жэле, сок, настойкі), шыпшыне (ягады можна сушыць ці пускаць на варэнне).

### САДОВЫЯ ЛЕКІ

У садах і на ўчастках можна ўбачыць і хенамелес, ці айву японскую. На гэтых невысокіх кустах, што шыкоўна квітнеюць, выспяваюць плады, якія можна дадаваць у чай як заменнік лімона. Ягады таксама сушаць, пускаюць на варэнне, робяць з іх мармелад, цукаты.

«Іншаземцаў» усё часцей пачынаюць сяліць на ўчастках людзі, якія клапоцяцца пра сваё здароўе. Так, садаводы ацанілі абляпіху, усё большую папулярнасць набываюць годжы і бружмель. Заслугоўвае ўвагі і гумі (лох мнагакветкавы) — госць з Далёкага Усходу. Менавіта на ім растуць маладзільныя ягады з высокай канцэнтрацыяй антыаксідантаў і біялагічна актыўных рэчываў. У Японіі гумі шырока выкарыстоўваюцца як «жывыя лекі» ад розных хвароб, а таксама як вітамінная дабаўка ў дзіцячым харчаванні.

Вяртае маладосць і шаўкоўніца. За карысныя якасці ў сярэдняй Азіі яе называюць «цар-ягадай». У асаблівай пашане яна ў старэйшага пакалення, людзі вераць, што ягада падаўжае працягласць жыцця. Шаўкоўніца змяшчае шмат жалеза ў лёгказасваяльнай форме. Будучыя мамачкі, людзі з нізкім гемаглабінам, абавязкова звярніце на яе ўвагу. Дарэчы, у садзе Інстытута пладаводства шаўкоўніца — адна з самых старых раслін, ёй пераваліла за паўстагоддзя, і кожны год вялізнае дрэва цешыць сакавітымі ягадамі.

Але не трэба забывацца і на культуры, якія ўжо даўно вядомыя нашым садаводам: бузіну, глог, аронію чарнаплодную. На жаль, да гэтага часу мала ў садах гранатавай рабіны (атрыманай у выніку скрыжоўвання чырвонай і чорнай). Яна паніжае ўзровень халестэрыну ў крыві (рэкамендуецца ўжываць па пяць-сем ягад штодня), некаторыя людзі спецыяльна яе маразяць. З'явіліся на рынку і новыя сарты іргі (часам яе называюць беларускімі разынкамі), у тым ліку нізкарослыя, прыстасаваныя да механізаванай уборкі. І нават традыцыйныя парэчкі сёння мяняюцца. Добрая навіна для людзей, у якіх ёсць алергія на цёмныя ягады: можна вырошчваць і зялёныя парэчкі (з закрытымі вачыма па смаку іх не адрозніць ад чорных).

Сярод навінак — маліны сунічныя (яшчэ іх называюць тыбецкімі, нектарнымі). Ягады выкарыстоўваюць для ўпрыгожвання пірожных і ў лікёрнай прамысловасці.

Выпрабоўвалі вучоныя і маліны арктычныя — княжаніку. Яна прыйшла ў калекцыю з Новасібірскага батанічнага саду. Але, як паказала назіранне, — беларускі зменлівы клімат (то цёпла, то маразы, то засуха) для расліны — стрэс.

### ВІТАМІНЫ КРУГЛЫ ГОД?

Сёння можна падабраць культуры для саду так, каб ягады на іх выспявалі з мая па кастрычнік, а ці магчыма «вітамінны перыяд» зрабіць яшчэ больш працяглым? Сучасныя тэхналогіі дазваляюць планаваць ураджаі. Напрыклад, можна разлічыць пасадкі суніц так, каб атрымаць свежыя ягады ў пэўным месяцы (хоць у сакавіку, хоць у лютым). Зразумела, тут звычайныя ўмовы не падыходзяць, сёння ва ўсім свеце назіраецца пераход на вырошчванне ягадных культур у абароненым грунце, тунэлях, у цяпліцах з ацяпленнем. Важна загадзя падрыхтаваць пасадачны матэрыял. Як правіла, такія саджанцы з закрытай каранёвай сістэмай захоўваюцца ў халадзільніках, у пэўны час пераносяцца ў цяпліцу, дзе абуджаюцца і даюць ураджаі пад сплянаваныя чалавекам даты. У Беларусі таксама будуць працаваць у гэтым кірунку.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# «Ты адно запомні, браце, са «Звяздой» — цяплей у хаце!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэта мы да таго, што днямі ў рэдакцыі «Звязды» адбыўся чарговы розыгрыш — цеплавентылятараў Normann і электракаміна Electrolux.

Як вырашаўся іх лёс, даўнім чытачам расказваць не трэба, нядаўнім — хіба «праз коску». Такім чынам, кожны, хто аформіў падпіску на «Звязду» на чацвёрты квартал альбо другое паўгоддзе гэтага года і прэтэндаваў на выйгрыш, мог запоўніць невялічкую картку-купон (яны друкаваліся і ў час новай падпіснай кампаніі, вядома ж, будуць друкавацца па пятніцах) — і даслаць яго на адрас газеты. Тут, у рэдакцыі, усе атрыманыя карткі рэгістраваліся і сартаваліся з тым, каб гарантаваць атрыманне прызоў у кожнай вобласці і горадзе Мінску.

Што важна яшчэ — непасрэдны лёс падарункаў для падпісчыкаў вырашалі такія ж падпісчыкі. Прынамсі, на гэты раз імі аказаліся **жыхары сталіцы сужэнцы Людміла Яўгенаўна і Мікалай Сямёнавіч Сідарэвічы, а таксама прыпевачніца, аўтарка многіх вершаў, «вясёлых і праўдзівых гісторый» Любоў Міхайлаўна Чыгрынава** *(на здымку)*. Менавіта яны (дарэчы, вельмі прыгожыя людзі!) з чароўнага звяздоўскага капелюша і выцягнулі шчаслівыя купоны. Чые? Чытайце:

**ЦЕПЛАВЕНТЫЛЯТАР NORMANN ВЫЙГРАЛІ:**

**Уладзімір Іванавіч Сямашка, г. Брэст;**
**Мікалай Якаўлевіч Карповіч, г. Віцебск;**
**Іна Віктараўна Кавалёва, г. Гомель;**
**Яўген Сцяпанавіч Талканіца, г. Гродна;**
**Лідзія Фёдараўна Барадзенка, в. Чырвоная Слабада Салігорскага раёна Мінскай вобласці;**
**Ганна Сцяпанаўна Туніловіч, г. Глуск Магілёўскай вобласці;**
**Валянціна Сямёнаўна Ёрш, г. Мінск.**

**СУПЕРПРЫЗ — ЭЛЕКТРАКАМІН ELECTROLUX — ВЫЙГРАЎ**

**Іосіф Браніслававіч Паўкалас з в. Навасёлкі Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці.**

Віншуем шчаслівчыкаў! Тым жа, каму на гэты раз удача не ўсміхнулася, скажам: не крыўдуйце — вы ж нічога не страцілі... Магчыма — нават надзеі, што наступны раз...

Ён — будзе! І хутка. З якімі прызамі? Пакуль сакрэт. Сачыце за газетай.

**АФІЦЫЙНА.**

**Арганізатарам рэкламнай гульні «Са «Звяздою» не замерзнеш!» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.**

**Рэкламная гульня «Са «Звяздою» не замерзнеш!» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 27.08.2018 г. (пасведчанне № 3366) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 5 верасня па 31 снежня 2018 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2018 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 120 падпісчыкаў. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.**

**Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 263 66 73.**

На заметку

# ВОСЬ ТАКАЯ ПАХУЧАЯ ЗЕЛЯНІНА РАСЦЕ Ў НАС!

**З году ў год на сваіх дачных сотках мы вырошчваем такую цудоўную расліну, як любіста. І выкарыстоўваем яе пры марынаванні і засолках агуркоў. Смак і водар — непаўторныя. Суседзі і сябры ў захапленні ад нашых хатніх нарыхтовак, у якія мы дадаём лісточкі любісты. Таксама ёй добра прыпраўляць першыя і мясныя стравы.**

Вырасціць любісту зможа нават дачнік-пачатковец. Я параіў бы агароднікам пасеяць насенне ў верасні — кастрычніку ў адкрыты грунт — і ўсходы вы атрымаеце ўжо ранняй вясной.

Ведайце таксама, што для добрага росту любісты найлепшы варыянт — зацененая градка з гліністай ці тарфяной глебай. А вось на адкрытым сонечным месцы расліна часам жаўцее, яе наземная частка можа загінуць. Увільгатняць глебу трэба ўмерана, бо лішак вады можа прывесці да хвароб і адмірання карэння.

Зразумела, глебу пад расліну трэба ўзбагаціць попелам, суперфасфатам, перагноем, мачавінай і выспелым кампостам.

**Сакрэты фасолі**

Ці ведалі вы, што фасоля — чэмпіён па колькасці бялку? А цынк, на які яна багатая, станоўча ўплывае на вугляводны абмен. Чырвоная фасоля садзейнічае нават пахудзенню. Таму я рэкамендую многім яе садзіць.

Калі ў вас фасоля дрэнна расце, яе трэба абавязкова падкормліваць мінеральнымі ўгнаеннямі (20 грамаў суперфасфату і 10—15 грамаў калійных угнаенняў на 10 літраў вады). Пасля падкормак расліну трэба добра паліць і парыхліць глебу. Пры недахопе вільгаці ніжнія лісты могуць засыхаць, а струкі будуць дрэнна расці.

А яшчэ цудоўна кусты фасолі апудрываць попелам.

**Яўген САЛАНОВІЧ.**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ
## по продаже имущества унитарного производственного предприятия «Эвилам»

| | |
|---|---|
| Дата, время, место и форма проведения торгов, предмет торгов, его местонахождение, начальная цена, порядок ознакомления | 19.11.2018 в 11.00 назначены торги в форме аукциона по адресу: г. Витебск, проспект Фрунзе, 81/19 по продаже:<br>лот № 1 – Пресс кривошипный КД2128Е, инвентарный номер 20309, стоимостью 3005,16 рубля с НДС;<br>лот № 2 – Пресс кривошипный КД2126 инвентарный номер 21184, стоимостью 2367,88 рубля с НДС;<br>лот № 3 – Пресс кривошипный КД2126 инвентарный номер 21330, стоимостью 2367,88 рубля с НДС;<br>лот № 4 – Пресс кривошипный КД2326 инвентарный номер 936, стоимостью 2721,18 рубля с НДС;<br>лот № 5 – Пресс кривошипный КД2124Е инвентарный номер 20268, стоимостью 1946,18 рубля с НДС;<br>лот № 6 – Пресс кривошипный КД2324 инвентарный номер 1611, стоимостью 3005,16 рубля с НДС;<br>лот № 7 – Пресс кривошипный КД2324 инвентарный номер 1832, стоимостью 1952,65 рубля с НДС;<br>лот № 8 – Пресс кривошипный КД2322 инвентарный номер 1604, стоимостью 1644,44 рубля с НДС,<br>расположенные по адресу: г. Витебск, проспект Фрунзе, 81/19.<br>Лоты можно осмотреть, предварительно связавшись с ликвидатором по тел. 80297118733 |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной цены предмета торгов |
| Сведения о продавце и организаторе торгов, контактные телефоны | Унитарное предприятие «Эвилам», 210101, г. Витебск, проспект Фрунзе, 81/19, УНП 300203528, тел./факс: 80212557253.<br>Организатор – ИП Железовский Юрий Александрович, г. Витебск, пр. Строителей, д. 1, (ТЦ «Континент»), офис № 157, тел. +375297118733 |
| Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, банковские реквизиты для его зачисления | Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 16.11.2018 включительно на счет унитарного предприятия «Эвилам» № BY04BLBB30120300203528001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской области, БИК BLBBBY2X, УНП 300203528. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается |
| Место, дата, время начала и окончания приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов | г. Витебск, проспект Фрунзе, 81/19,<br>Дата и время начала приема заявлений – 17.10.2018 в 11.00;<br>Дата и время окончания приема заявлений – 16.11.2018 в 17.00;<br>К заявлению прилагаются:<br>1. документ, подтверждающий внесение суммы задатка;<br>2. для резидентов копия устава, свидетельство о государственной регистрации, доверенность для представителя юридического лица, документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица;<br>3. нерезидентам – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;<br>4. ИП резидент – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник;<br>5. ИП нерезидент – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;<br>6. представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;<br>7. представителем иностранного физического лица, ИП – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.<br>При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, ИП, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию |
| Информация о необходимости возмещения участником, выигравшим торги, затрат на организацию и проведение торгов | Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение торгов: на оценку в размере 357,92 рубля и на объявление в размере 319,68 рубля |
| Порядок оформления участия в торгах | К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке |
| Порядок оформления результатов торгов | В день проведения торгов участник, выигравший торги, и все присутствующие члены комиссии подписывают протокол о результатах торгов в двух экземплярах, который утверждается организатором торгов в день их проведения. После предъявления копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение торгов, в установленном порядке в соответствии с условиями торгов между продавцом и участником, выигравшим торги, либо единственным участником конкурса, либо единственным участником аукциона заключается договор купли-продажи в трехдневный срок |
| Срок оплаты приобретенного предмета торгов | 7 календарный дней с даты подписания договора купли-продажи предмета торгов |
| Дополнительная информация | В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 16 ноября 2018 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование лотов | Адрес лотов | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %) | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение площадью 18,9 кв. м**, в помещении связи с инв. № 340/D–213112, помещение на 6-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент местоположения – 1,0 | г. Речица, ул. Советская, 66-2 | **76,12** | 7,61 |
| 2 | **Изолированное помещение площадью 12,6 кв. м**, в помещении связи с инв. № 340/D–213112, помещение на 3-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент местоположения – 1,0 | | **50,75** | 5,08 |
| 3 | **Изолированное помещение площадью 300,0 (294,2+5,8) кв. м**, в помещении связи с инв. № 340/D–213112, помещение на 3-м этаже. Коэффициент спроса – 2,5. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент местоположения – 1,0 | | **1 208,25** | 120,83 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце** | Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8 (0232) 79-67-44 |
| **Срок подачи заявления** | **с 16.10.2018 г. по 14.11.2018 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга». **Подача документов по почте не допускается. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения** |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в филиале № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, ул. Барыкина, 94, BIC AKBBBY21302, УНП 400395996, **получатель – Гомельский филиал РУП «Белпочта»,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления) |
| **Условия пользования** | для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств) |
| **Размер штрафа** | Лот № 1, 2 – 0,5 базовой величины, лот № 3 – 20 базовых величин, согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству) |

**Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и предоставить необходимые документы:** копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене увеличенной на **5 (пять) процентов**. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии Положения «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности. **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 80 %) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ГРОДНЕНСКИЙ МЯСОКОМБИНАТ»

| | | | |
|---|---|---|---|
| | **Лот № 1** | | |
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Капитальное строение инв. № 400/С-118998** (жилой дом) общей площадью 17,8 кв. м, кирпичное, одноэтажное, 1972 г. п. Отопление печное, электроснабжение – открытая проводка (не функционирует), водопровод, канализация отсутствуют. Составные части и принадлежности: сени, веранда, 3 сарая, погреб с погребней, уборная | | |
| Местонахождение имущества: **Гродненская обл., Гродненский р-н, Поречский с/с, аг. Поречье, ул. Заречная, д. 25** | | | |
| Информация о земельном участке | Площадь 0,2500 га, кадастровый номер 422087507101000878, назначение – для обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения (обременения) прав: земельный участок расположен в водоохранной зоне рек и водоемов (0,2500 га), в охранной зоне электрических сетей (0,0023 га). Право аренды: по 18.12.2116 г. | | |
| Начальная цена | **4340 белорусских рублей** | Сумма задатка (5 %) | **217 белорусских рублей** |
